МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

ПРАВАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# Катаванні і жорсткае абыходжанне ў Папраўчай калоніі №1 г. Наваполацк:

**«Яго асабіста начальнік калоніі збіваў, прычым збіваў да такой ступені, што ў хлопца адкрыўся крывацёк з прамой кішкі»**

Грамадскае расследаванне



© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2025

# Змест


Рэзюмэ ... 3
Агульная інфармацыя пра ПК-1 ... 5
Структура калоніі ... 8
Паборы са зняволеных і вылікі на ўтрыманне ... 10
Этап, сустрэча ў калоніі, каранцін ... 12
Побыт у калоніі ... 17
Карэспандэнцыя, пасылкі, атаварка, спатканні, званкі, адвакаты ... 21
Праца ў ПК-1 ... 24
Нефармальная турэмная іерархія ... 30
«Нізкі сацыяльны статус» — дадатковы рычаг ціску на зняволеных ... 34
Палітычныя зняволеныя: жоўтыя біркі, 6-дзённы працоўны тыдзень і асаблівы рэжым утрымання ... 39
Віктар Бабарыка: поўная ізаляцыя і «вугальнае пекла» ... 43
Андрэй Пачобут. «Яго ўсяляк там ламалі, але ён трывалы і непахісны» ... 50
Ігар Лосік: голас свабоды, які хочуць знішчыць ... 53
Правакацыі і «стукацтва» ... 56
Фізічны і псіхалагічны гвалт над зняволенымі ... 57
«Парушэнні» і пакаранні ... 60
ШІЗА і ПКТ ... 62
Медыцынскае абслугоўванне: «Пакуль можаш перасоўваць ногі — ніякай дапамогі не атрымаеш» ... 68
Смерці ў калоніі ... 73
Супрацоўнікі калоніі ... 75
Начальнік калоніі і яго намеснікі ... 76
Машадзіеў Руслан Хікметавіч ... 77
Пальчык Андрэй Сяргеевіч ... 79
Аператыўнікі ... 85
ДПНК ... 87
«Атраднікі» ... 90
Іншыя супрацоўнікі калоніі ... 93
Высновы ... 97

# Скароты ў дакуменце

| | | |
|---|---|---|
| **ПК-1** | — | Папраўчая калонія №1. |
| **ДВП** | — | Дэпартамент выпраўлення пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў. |
| **ДПНК** | — | дзяжурны памочнік начальніка калоніі. |
| **УДВ** | — | умоўна-датэрміновае вызваленне. |
| **КК** | — | Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь. |
| **ПУР** | — | Правілы ўнутранага распарадку. |
| **ШІЗА** | — | штрафны ізалятар. |
| **ПКТ** | — | памяшканне камернага тыпу. |
| **НСС** | — | «нізкі сацыяльны статус». |
| **ССАПА** | — | секцыя садзейнічання арганізацыі побыту асуджаных. |
| **ЦЭЦ** | — | цеплаэлектрацэнтраль. |

# Рэзюмэ

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца агляд сітуацыі са зняволенымі ў папраўчай установе «Папраўчая калонія №1» упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў па Віцебскай вобласці. Аўтарамі дакумента былі вывучаныя 13 інтэрв'ю (892 старонкі тэксту) з былымі асуджанымі, якія адбывалі пакаранне ў ПК-1 у перыяд з лютага 2021 года па студзень 2025 года. Сярэдні тэрмін адбытага імі пакарання складае 8,3 месяцы, а агульная працягласць тэрміну знаходжання — 149,5 месяцаў.

Апытаныя экспертамі Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі былыя зняволеныя апісваюць падрабязнасці іх знаходжання ў самай суворай у дачыненні да зняволеных калоніі ўзмоцненага рэжыму, у якой утрымліваюцца як асуджаныя за сур'ёзныя крымінальныя злачынствы, так і палітычныя зняволеныя — людзі, асуджаныя па палітычных матывах. Менавіта для такой катэгорыі зняволеных у гэтай калоніі супрацоўнікамі адміністрацыі створаныя самыя жорсткія ўмовы ўтрымання. Ноу-хау пенітэнцыярнай сістэмы Беларусі ў цяперашні час з'яўляецца татальны кантроль, бесчалавечнае стаўленне і поўная інфармацыйная блакада асабістых ворагаў асобы, якая займае пасаду прэзідэнта, іх утрымліваюць у ПК-1: Віктара Бабарыку, Андрэя Пачобута, Ігара Лосіка[1] і іншых.

У калоніі да гэтага часу самой адміністрацыяй падтрымліваецца і выкарыстоўваецца ў сваіх мэтах нефармальная турэмная іерархія, ганебнай і зневажальнай праявай якой з'яўляецца каставая сістэма падзелу зняволеных (гл. раздзелы Нефармальная турэмная іерархія, «Нізкі сацыяльны статус»).

У дакуменце апісваюць розныя этапы знаходжання ў калоніі, пачынаючы з каранціну, знаходжання ў атрадах і да ўмоваў працы зняволеных. Асобная ўвага нададзеная мерам спагнання са зняволеных, фізічнаму і псіхалагічнаму гвалту з боку супрацоўнікаў.

Дакумент апісвае дзеянні як былога начальніка калоніі Андрэя Пальчыка,

[1] Падчас падрыхтоўкі матэрыялу палітзняволенага Ігара Лосіка вывезлі за межы Беларусі ў складзе групы іншых палітзняволеных, якіх Аляксандр Лукашэнка фактычна вымяняў у амерыканскага ўрада на змякчэнне накладзеных на Беларусь санкцыяў. Дадзены выгляд «вызвалення» з'яўляецца гвалтоўнай дэпартацыяй.

так і цяперашняга Руслана Машадзіева.[2] Створаны кіраўніцтвам калоніі рэжым кіравання і бяздушнае стаўленне да зняволеных прыводзіць да страты здароўя, псіхалагічных зрываў, дэпрэсіі і нават смерцяў, у тым ліку суіцыдаў. Як расказваюць былыя зняволеныя, медыцынскае абслугоўванне знаходзіцца на самым нізкім узроўні, хранічныя захворванні не лечацца, у выпадках з вострымі болямі зняволеныя вымушаныя здавольвацца мінімумам лекаў, якія выдаюцца медыкамі з вялікай неахвотай.

Апісанні супрацоўнікаў калоніі змяшчаюць факты пра адкрытыя здзекі са зняволеных, парушэнні нормаў і правілаў абыходжання з імі (гл. раздзелы Правакацыі і стукацтва, Супрацоўнікі калоніі). Аўтары дакумента лічаць неабходным адзначыць, што ў некалькіх інтэрв'ю яны сустракалі шэраг станоўчых ацэнак дзеянняў супрацоўнікаў, якія непрадузята выконваюць сваю працу.

Аўтары канстатуюць, што ў Папраўчай калоніі №1 груба парушаюцца міжнародныя стандарты знаходжання зняволеных у ізаляцыі.
Інтэрв'ю з былымі асуджанымі, якія адбывалі пакаранне ў Навапалацкай калоніі №1, дадзеныя для даследавання «Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі» і Праваабарончым цэнтрам «Вясна». Пры апазнанні супрацоўнікаў калоніі выкарыстоўваліся матэрыялы, дадзеныя ініцыятывай «Кіберпартызаны». Аўтары ўсведамляюць сваю адказнасць за інфармацыю, якую адкрываюць грамадскасці ў дадзеным грамадскім расследаванні. З гэтай прычыны ўсе персанальныя дадзеныя з інтэрв'ю прыбраныя, факты пра іншых асуджаных таксама ананімізаваныя. Эксперты «Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі» гатовыя надаць кампетэнтным органам усе гэтыя дадзеныя для незалежнага расследавання ў будучыні.

[2] Абодва начальнікі калоніі ўключаныя ў санкцыйныя спісы Еўрасаюза за жорсткае абыходжанне са зняволенымі.

# Агульная інфармацыя пра ПК -1

«Наваполацкая калонія размешчаная ў прамысловай зоне. Яе там быць не павінна, людзі не могуць там жыць, бо экалогія вельмі дрэнная. Нават вада там амаль прамысловай якасці». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)



Фота 1. Наваполацкая Папраўчая калонія №1. Фота: «Беларусская тюрьма» / VK. Крыніца: https://news.zerkalo.io/life/101777.html

Папраўчая ўстанова «Папраўчая калонія №1» упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў па Віцебскай вобласці знаходзіцца па адрасе: 211440, Віцебская вобл., г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, д. 8. Калонія разлічаная на 1500 чалавек. Акрамя асуджаных па палітычных артыкулах там адбываюць пакаранне людзі, якія здзейснілі цяжкія злачынствы: разбой, наўмысныя забойствы, нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў.

Былыя баракі для будаўнікоў Наваполацкага нафтаперапрацоўчага заводаператварылі ў папраўча-працоўную калонію №10. У 2014 годзе калонію

пераўтварылі ў лячэбна-працоўны прафілакторый (ЛПП №8), дзе прымусова лячылі людзей, якія пакутуюць ад алкагольнай залежнасці, і прымушалі іх працаваць на шкодных вытворчасцях. У 2017 годзе ўстанове вярнулі статус папраўчай калоніі[3], прысвоіўшы нумар «1»[4].

Наваполацкую калонію ўзмоцненага рэжыму №1 называюць самай бруднай з экалагічнага пункту гледжання. Тэрыторыя калоніі з усіх бакоў аточаная нафтаперапрацоўчым і хімічным заводамі, з-за чаго паветра мае выразны «хімічны» прысмак.

> «...рэфракцыйная калона завода “Нафтан”, па якой пераганяюць нафту і выпараюць фракцыі, знаходзіцца ад зоны ўсяго за кіламетр. З яе ідзе дым, пары, якія з'яўляюцца падчас прадзьмування трубаў для тэхнічнага прызначэння. У некаторыя дні якасць паветра была такая, што на выхадзе з барака рэзала вочы».




Фота 2. Від на завод «Нафтан», на пярэднім плане — Папраўчая калонія №1. Наваполацк, Беларусь. 11 верасня 2021 года. Фота: Агата Квяткоўская, «Белсат». Крыніца: https://news.zerkalo.io/life/101777.html

[3] https://etalonline.by/document/?regnum=P31700223
[4] https://www.svaboda.org/a/32826995.html

У ПК-1 сіламі зняволеных вырабляюць корпусную і садовую мэблю, бетонныя вырабы, а таксама піламатэрыялы і прадукцыю з драўніны. Вытворчасць ажыццяўляецца на аснове Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Адзінка»[5].

Гэтую калонію на працягу многіх гадоў выкарыстоўвалі для ізаляцыі вядомых апанентаў рэжыму Лукашэнкі. Цяпер там утрымліваюць вядомага палітыка і мецэната, кіраўніка «Белгазпрамбанка» Віктара Бабарыку, журналіста Андрэя Аляксандрава, стрыечнага брата Паўла Латушкі Анатоля Латушку, дырэктара газеты «Беларусы і рынак» Канстанціна Залатых, сябра «Саюза палякаў Беларусі» Андрэя Пачобута і іншых вядомых палітычных зняволеных.

У наваполацкай калоніі ў розны час утрымлівалі і іншых вядомых палітзняволеных. У 2011 годзе тут некалькі месяцаў утрымліваўся кандыдат у прэзідэнты на выбарах 2010 года Андрэй Саннікаў.

Пад жорсткім прэсінгам адбываў пакаранне ў гэтай калоніі да накіравання ў турму палітзняволены Святаслаў Барановіч[6] у 2018 годзе, таксама грамадскія актывісты Мікіта Ліхавід і Алесь Кіркевіч[7], частку пакарання правёў у Наваполацку палітзняволены-анархіст Ігар Аліневіч.

Тут жа адбываў пакаранне журналіст Андрэй Кузнечык[8], больш за год правёў у гэтай калоніі блогер Аляксандр Кабанаў, аўтар YouTube-канала «Народный репортер» і прэс-сакратар ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай. Да верасня 2022 года ў наваполацкай калоніі сядзеў Дзяніс Урад, капітан Генштаба ўзброеных сілаў, які атрымаў 18 гадоў калоніі за «здраду дзяржаве».

---

[5] https://www.belarusinfo.by/rek/98843

[6] https://spring96.org/ru/news/91133

[7] А. Кіркевіч напісаў пра сваю адсідку кнігу «Сем месяцаў у беларускай турме» і ў 2013 годзе атрымаў літаратурную прэмію імя Францішка Аляхновіча.

[8] Андрэй Кузнечык, журналіст «Радыё Свабода», быў вызвалены са зняволення ў Беларусі ў межах вызвалення палітвязняў пры ўдзеле адміністрацыі Трампа ў лютым 2025 года.

# Структура калоніі

У жылой зоне калоніі пяць баракаў, у якіх утрымліваюцца зняволеныя. У першым бараку (па тэрміналогіі зняволеных — «казлятня») утрымліваюцца зняволеныя, якія абслугоўваюць кухню, ажыццяўляюць будаўнічыя, сантэхнічныя работы па калоніі. Бытавыя ўмовы тут крыху лепшыя, чым у іншых бараках.

Пяты барак — гэта два атрады і каранцін з выхадамі ў розныя бакі. Знутры будынка таксама няма перасячэнняў для зняволеных розных атрадаў.
З месцаў агульнага карыстання — клуб, сталоўка, цырульня, сумешчаная з душавымі, невялікі храм. Далей памяшканне, дзе захоўваюцца матрацы і праводзіцца іх дэзінфекцыя.

У калоніі ёсць бальнічны корпус і асобна стаіць тэхнікум, у якім навучаюцца зняволеныя. Асобны будынак — памяшканне для спатканняў.
Прамзона складаецца з двух вялікіх цэхаў і зоны для вытворчасці вугалю. Асобна стаіць піларама, якая афіцыйна закрытая: яна працуе, але на час праверак у калоніі яе закрываюць. Далей знаходзяцца дзве сушылкі для дошак і будынак унутранай ЦЭЦ калоніі.




Фота 3. Папраўчая ўстанова ПК-1. Гугл-мапы (з пазнакамі былога зняволенага).

1 — барак нумар 1, напалову незаселены, прызнаны аварыйным.
2 — барак нумар 2 цалкам заселены. На месцы другога барака, як і каля першага, знаходзяцца месцы для палення (шэрыя плямы на здымках). Таксама там можна ўбачыць форму лакальнага ўчастка паміж першым і другім баракам. Гэта агульная тэрыторыя, куды некалькі атрадаў маюць выхад. Каля другога барака справа відаць лінію, якая аддзяляе ўнутраны дворык, — гэта дворык 5-га і 6-га атрада.




Фота 3. Папраўчая ўстанова ПК-1. Гугл-мапы (з пазнакамі былога зняволенага).

3 — сталоўка. Участак каля лічбы 3 у тым жа будынку — клуб.
4 — памяшканне ШІЗА і ПКТ. Самая халодная камера знаходзіцца ў так званым «боце» (верхні правы кут, з двух бакоў сцены). Мяркуючы па апісанні, яна істотна халадней за ўсю астатнюю зону.
5 — корпус з атрадам (злева), корпус каранціну (справа).
6 — барак на 1-шы і 2-гі атрад, так званая «казлятня». Паміж лічбамі 6 і 7— іх лакальны ўчастак.
7 — выдача перадач. На лініі дамоў 7–8 знаходзяцца цырульня, душы, замена матрацаў, у адным з памяшканняў ажыццяўляюцца званкі.
8 — бальнічны комплекс. Справа паліклініка (зялёны прамакутнік). Пры новым кіраўніцтве ўсе дрэвы ў раёнах 19 і 8 спілаваныя.
9 — тэхнікум.
Шэры прамакутнік паміж 9 і 12 — штаб.
Мяжа, якая аддзяляе жылую зону ад прамзоны, ідзе па лініі 6, 7, 8, 9 і вышэй, а 10, 11, 12 і ніжэй — гэта прамзона, яны аддзеленыя фізічна.
10 — ЦЭЦ. У сярэдзіне — сушылка і сховішча дошак. Паміж 10 і 11 — новая сушылка для дошак.
11 — роспуск дошак (бярвёны распускаюцца на дошкі). Калі не памыляюся, менавіта там аднойчы павесіўся зняволены. З размовы зняволеных магу сказаць, што суіцыдаў у калоніі — стабільна адзін-два на год.
12 — цэх, у якім рамантуюць аўтамабілі, у асноўным свае. Самы правы — ваентара. Потым цэх дрэваапрацоўкі са станкамі, там калоцяць паддоны.
13 — прамысловы цэх. У гэтым будынку пад лічбай 10 з дроту робяць корды. Паміж лічбай 13 і 14 (доўгі белы прамакутнік) — яшчэ адно памяшканне тэхнікума.
14 — перапрацоўка. Уздоўж тарца 14-га барака справа — швейны ўчастак, потым перапрацоўка адкідаў: мыюць пакеты, аддзіраюць, перапрацоўваюць, потым здрабняюць. Там стаяць апараты, якія вырабляюць пакункі. Далей перабіраюць бубкі, адкіды палімера, якія дзеляць на белае і чорнае, каб рабіць розныя пакеты і плёнку.
15 — прамысловая зона, дзе мыюць працоўную форму зэкаў. Участак пад 12-м — мылаварка. Хлебапякарня знаходзіцца ў самым нізе, там доўгі час працаваў Бабарыка, там жа знаходзіцца вытворчасць пліткі.
16 — аварыйная лесапільня, якая працягвае працаваць.
17 — водазабор. Паміж 17 і 14 паляць вугаль.
18 — спартовы гарадок, вулічная трэнажорная зала. Палітычных туды не пускаюць.
19 — спартовая пляцоўка для футбола. Палітычных туды таксама не пускаюць.
20 — памяшканне для спатканняў, доўгі калідор з пакоямі.
21 — шлюз пры ўездзе ў калонію. Там даглядаюцца машыны і ўсё астатняе.
22 — памяшканне, дзе не могуць знаходзіцца зэкі. Там працуюць цэнзары, знаходзяцца кабінеты афіцэраў.

## Паборы са зняволеных і вылікі на ўтрыманне

У Беларусі выдаткі на ўтрыманне зняволеных у калоніях пакрываюцца за кошт дзяржаўнага бюджэту. Гэта азначае, што фінансаванне дзейнасці пенітэнцыярнай сістэмы, уключаючы харчаванне, адзенне, медыцынскае абслугоўванне і іншыя патрэбы зняволеных, ажыццяўляецца са сродкаў дзяржавы.

Нягледзячы на гэта, практыка пабораў са зняволеных распаўсюджаная ва ўсіх папраўчых установах ДВП пад выглядам добраахвотных ахвяраванняў (так званага «мецэнацтва»). У кожнай установе ёсць свае нюансы, але ў асноўным грошы асуджаных ідуць па наступных кірунках.

З іх асабістых рахункаў вылічваюць грошы за ўтрыманне, харчаванне, камунальныя паслугі і іншыя выдаткі.

«...у пенсіянераў практычна ўсё вылічваюць за ўтрыманне: за электрычнасць, ацяпленне».

«У лагеры табе выдаюць робу, абутак, трусы, шкарпэткі. Прыносяць разліковы ліст, што ты за гэта ўсё павінен заплаціць. Гэта 400–500 рублёў часта. Калі ты за гэта не заплаціш, не трапляеш ні пад УДВ, ні пад замену, ні пад што».

Таксама ў ПК-1 актыўна практыкуецца набыццё «пасадаў»і прывілеяў.

«...гэта, вядома, не для палітзняволеных. Ты мог ляжаць там, напрыклад, за 200 рублёў за месяц у санчастцы і нічога не рабіць. Ты набываеш сабе свайго кшталту вызваленне ад працы».

Прыгожы фасад калоніі забяспечваецца таксама за кошт фінансавання зняволенымі. Грошы ідуць на рамонты адміністрацыйных будынкаў, усталёўку шклопакетаў, абнаўленне мэблі і тэхнікі.

«Калі хочаш, каб стаўленне да цябе было лаяльным, то ты павінен паставіць пластыкавыя вокны тут і тут.

Чалавек піша дадому, тэлефануе. Ягоныя сваякі гэтыя вокны аплачваюць і пішуць заяву, што яны надаюць матэрыяльную дабрачынную дапамогу калоніі».

«Адміністрацыя ведае, хто багацейшы, у каго нейкі бізнес. Яны да іх прыходзяць, адкрыта кажуць: “З цябе 500 даляраў у гэтым месяцы, трэба пералічыць на такі-та рахунак. Тэлефануй сваякам, пералічвай!”»

У зняволеных, якія адмаўляюцца плаціць, узнікаюць праблемы.

«Быў адзін асуджаны, з якога вымагалі ўвесь час грошы. У выніку яму гэта надакучыла, і ён напісаў заяву ў пракуратуру. Заява гэтая з лагера не сышла. Яго выклікалі на дыванок, сказалі: “Ты што робіш?”. Ён сказаў: “У мяне будзе адвакат, я ўсё роўна даб'юся, каб гэта было агучана”. Гэтага зняволенага кінулі ў ШІЗА, а загадчыка гаспадаркі і ССАПА таксама закрылі ў ШІЗА і знялі з пасадаў. Хаця яны гэта рабілі па загадзе непасрэдна начальніка. Яны былі абураныя, што начальнік загадвае, а потым іх жа і “злівае”».

# Этап, сустрэча ў калоніі, каранцін

## Этапаванне.

Этапаванне зняволеныя апісваюць як складаны і непрыемны фізічна і маральна працэс. Для многіх палітычных зняволеных ён ускладняецца яшчэ і тым, што яны падчас этапа ўвесь час знаходзяцца ў кайданках. Пераносіць торбы з рэчамі, сядзець і спаць у вагоне каля 12 гадзінаў, хадзіць у прыбіральню — усе гэтыя дзеянні трэба было рабіць са скутымі рукамі. У той жа час не палітычныя зняволеныя праходзяць этап са свабоднымі рукамі.

> «...калі забойца ідзе без кайданкоў і смяецца з нас. А ты за каментар... ідзеш, ледзь цягнеш гэтую торбу. Таму што рукі скутыя кайданкамі».

Адзін з былых зняволеных расказаў, як давялося праходзіць этап зняволенаму з ментальнымі праблемамі.

> «Ён быў не ў сабе, гэта было відавочна. У яго пачаліся панічныя атакі, ён прасіў адшпіліць кайданкі. Але яму перашпілілі рукі назад. Такім чынам у нас спыняецца самакалецтва: чалавеку проста зашпілілі рукі за спіну, і ён ехаў так усю дарогу. Ён ехаў у адзіноце, а мы ехалі пад завязачку набітыя ў купэ».

## Сустрэча ў калоніі.

З цягніка зняволеных пагрузілі ў аўтазакі і прывезлі ў ПК-1. У актавай зале з імі правялі «вітальную» гутарку. Па перыметры памяшкання стаялі супрацоўнікі з дубінкамі.

> «Размова як з людзьмі найніжэйшага гатунку. Да палітычных былі пытанні. Кантэкст размовы [заключаўся ў тым], што да гэтага “ў вас быў курс маладога байца", а цяпер “вы хлябнеце па-сапраўднаму”».

Таксама проста на першай сустрэчы зняволеных пачалі дзяліць на статусы.

«Спачатку яны спыталі, хто там з “нізкім статусам”, каб самім ведаць. А потым сталі называць іх па прозвішчы: “Устаньце, скажыце, якія там артыкулы”».

Зняволеных пастрыглі, ім выдалі адзенне. Пасля гэтага зноў вобшук, падчас якога людзі пазбавіліся многіх неабходных рэчаў, адзення і прадуктаў.

«Усе рэчы пазабіралі. Не прапусцілі лісты, якія я прывёз. Фактычна не прапусцілі шмат, што было дазволена».

## Каранцін.

Пасля першай працэдуры запалохвання зняволеных адправілі на каранцін. Перыяд знаходжання там усе зняволеныя апісваюць як адзін з самых жорсткіх: бясконцыя здзекі з боку персаналу і зэкаў, якія супрацоўнічаюць з адміністрацыяй; умовы ўтрымання, якія мяжуюць з катаваннямі.

«У каранціне было асаблівае стаўленне з боку адміністрацыі. Такі маральна-псіхалагічны ціск, каб хутчэй адаптаваць зняволенага да гэтай рэальнасці, запалохаць, зламаць пасля следчага ізалятара рэшткі псіхікі вольнага чалавека».

«...калі мы заехалі [у каранцін], было 25 градусаў марозу. Нам ісці праз усю зону, мы ў тапачках на босую нагу, у робах, без споднeй бялізны. Гэта жудасны холад. Вось так мы ў першы ж дзень прайшлі праз катаванне марозам».

Каранцін — гэта лакальная зона, аддзеленая ад усіх іншых плотам. Фактычна гэта барак, разлічаны на 30–40 чалавек, у якім два спальныя памяшканні, ложкі ў два ярусы, сталы. Таксама побач знаходзіцца санвузел і душ, у які пускалі толькі загадчыка гаспадаркай каранціну і «казлоў», якія супрацоўнічалі з адміністрацыяй. Асобна стаяць нары для асобаў «нізкага

сацыяльнага статусу».

Каранцін выконвае дзве функцыі. Першая — гэта медыцынская, для прадухілення распаўсюджвання інфекцый і вызначэння іншых захворванняў. Аднак медагляд тых, хто прыбыў, праводзілі вельмі павярхоўна, ніякія хранічныя дыягназы медыкаў не цікавілі.

«Быў нейкі фармальны медычны агляд. Іх цікавяць толькі рэчы, якія моцна заразныя, або тыя, ад якіх ты можаш прама вось тут памерці, каб ім паперак не пісаць».

Другая функцыя каранціну — адаптацыя зняволенага да ўмоваў і правілаў калоніі. Выяўляецца гэта найперш жорсткім ціскам на зняволеных на штодзённай аснове. Іх прымушаюць праводзіць бясконцыя прыбіранні, яны займаюцца вывучэннем ПУР, у тым ліку на пастраенні на вуліцы незалежна ад надвор'я і пары года, глядзяць прапагандысцкія тэлеперадачы.

«Штодзённыя прыбіранні, часам па некалькі разоў, прыбіранні ў выглядзе пакарання... Проста не даюць ніводнай хвіліны вольнага часу. Пасля мяне ўжо ўвялі правіла: людзей ставілі ў два шэрагі, і хтосьці чытаў правілы распарадку калоніі, а ўсе астатнія слухалі на вуліцы, незалежна ад надвор'я».

«...ленінскі пакой знаходзіцца ў гэтым жа памяшканні. Там тэлевізар здаровы стаіць. Па ПУР прапісана, што яго прагляд — раз у дзень на каранціне. Раз у дзень туды прыводзілі, садзілі, і мы павінны былі глядзець якую-небудзь вар'яцкую перадачу».

Многія былыя зняволеныя адзначаюць, што з мэтай псіхалагічнага ціску супрацоўнікі абмяжоўвалі зняволеным сон і ежу, выкарыстоўвалі халоднае надвор'е для стварэння невыносных умоваў утрымання.

«У каранціне ў нас абутак чамусьці заўсёды захоўваўся на вуліцы, нягледзячы ні на якія маразы.

У памяшканні ў шлёпанцах хадзілі, а раніцай выходзіш, абуваеш чаравікі — прыкіньце, -15 градусаў».

«Гадзіны па чатыры ў суткі давалі спаць. У холадзе трымаюць, ежы таксама не хапае. Калі чалавек паліць, то табе даюць усяго тры разы на дзень схадзіць папаліць па-хуткаму па пяць хвілінаў».

За кожнае парушэнне ў каранціне ішло пакаранне гаспадарчымі працамі.

«На каранціне адміністрацыя надае павышаную ўвагу ўсялякім бытавым дробязям і распарадку дня. Прымушаюць увесь час прыбірацца, нешта праць, мыць падлогу, вокны, сталы. Нават калі чыста, усё роўна мыеш».

Некаторых зняволеных прама з этапа маглі адразу размеркаваць у штрафны ізалятар. Многія расказваюць, што такія выпадкі былі неаднаразова.

«Падчас каранціну для палітычных існуе такая рэч, як абавязковае парушэнне. Абавязковае, таму што я не ведаю ніводнага палітычнага, хто б выйшаў з каранціну без парушэння. Я прасядзеў год у Следчым ізалятары, у мяне не было ніводнага парушэння. Тут да нас прыходзяць і даюць разнарадку: ты там тое, ты там тое — пішы тлумачальную».

Палітычныя зняволеныя расказваюць, што практычна ўсе яны прайшлі праз ШІЗА непасрэдна з каранціну, пра гэта таксама неаднаразова пісалі незалежныя СМІ[9]. Пра гэта пасля вызвалення расказваў Аляксандр Кабанаў. З вялікімі цяжкасцямі ў каранціне давялося сутыкнуцца палітзняволенаму Эдуарду Пальчысу, які практычна не выходзіў з ШІЗА, ПКТ, а потым быў пераведзены ў закрытую турму.

[9] https://euroradio.fm/ru/mnogo-smertey-i-pytki-chto-proiskhodit-v-kolonii-gde-derzhat-viktora-babariko

«... каранцін доўжыўся ўжо каля тыдня, і Пальчыс з'явіўся прыкладна праз дзесяць дзён. Пабыў некалькі дзён, і яго зноў забралі. Так яго адпускалі і забіралі тры ці чатыры разы. І я памятаю, ён кожны раз выходзіў і вельмі моцна адрозніваўся. Мы пачалі ўжо паціхеньку загараць, стоячы на праверках пад сонечнымі промнямі, а Пальчыс быў на фоне нас белы, як сцяна. Увогуле, яго так тры-чатыры разы выпусцілі і закрылі ўжо на ПКТ і на змену лагера».

Прычыны для пакарання, як правіла, дробныя і нязначныя. У каранціне надмерна жорстка прымушаюць выконваць вопісы маёмасці. Напрыклад, у атрадзе не перачытваюць цыгарэты — і раптам прымушаюць перачытваць паштучна.

«...у мяне было парушэнне за тое, што я стаяў у нейкі там час у курылцы з расшпіленым гузікам. Але што самае цікавае — я не палю, і я цярпець не магу тытунёвы дым, таму я ў курылцы не з'яўляюся, нават каб пагаварыць».

«Выклікае нас “атраднік” і кажа:
— Ну так і так, трэба вам па парушэнні...
— А што? Якое парушэнне?
— Напішам, тыпу ў аднаго верхні гузік не быў зашпілены — парушэнне формы адзення, і даклад не па форме. Не парцеся, нічога вам за гэта не будзе, вымова проста, у ШІЗА не паедзеце».

«З-за таго, што мы нібыта дрэнна прыбралі, мяне і яшчэ некалькіх чалавек, якія не падабаліся начальніку атрада каранціну, пацягнулі ў памяшканне з клеткамі. Нас расцягнулі —гэта калі ногі моцна шырэй за плечы, рукі выварочваюцца ў суставе, да сцяны далонькай. Пры працяглым стаянні гэта выклікае велізарную нязручнасць. Я ніколі не думаў, што хвілінаў праз трыццаць у пакоі, у якім стаяць тры ці чатыры чалавекі на такой расцяжцы, будуць такія гукі, быццам яны ровар круцяць. Гэта проста народ, які пыхкае».

# Побыт у калоніі

«Калі, напрыклад, на вуліцы -27 або ідзе завіруха, то ты стабільна прастаіш на праверцы без руху гадзіну. Ідзе дождж — таксама стаіш гадзіну. Потым у гэтым цалкам мокрым адзенні, яго не выціснуць, ты ідзеш і на “промку”». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Зняволеныя дзеляцца на 10 атрадаў па 80–90 чалавек у кожным. Атрады падзяляюцца на секцыі, пакоі, у якіх зняволеныя пражываюць на двух'ярусных ложках. Стандартныя пакоі разлічаныя на 8–16 чалавек. На кожнага чалавека прыпадае менш за два квадратныя метры асабістай прасторы. Людзі знаходзяцца ў цеснаце і ім даводзіцца прачынацца за гадзіну-паўтары да пад’ёму, каб ва ўмовах вельмі шчыльнага графіка паспець выканаць базавыя фізіялагічныя патрэбы.

Камеры істотна адрозніваюцца адна ад адной па ўзроўні тэмпературы, у сувязі з чым супрацоўнікі калоніі перамяшчаюць людзей у больш халодныя камеры ў якасці пакарання.

«Мяне паклалі на нару, якая знаходзіцца ў куце будынка. А там значна халадней. Там была наверсе цвіль — уся сцяна, і за галавой, і за спінай. Яна была вулічная. Нават зімой, калі працуе ацяпленне, сцяна халодная. Ты ляжыш і адчуваеш гэты холад».

Падчас праверак і пастраенняў зняволеных прымушаюць працяглы час знаходзіцца ў нерухомым становішчы на адкрытым паветры, незалежна ад умоваў надвор'я, уключаючы праліўны дождж і моцныя маразы.

«Зноў жа, зэк павінен пакутаваць. Ранішнія і вечаровыя праверкі: гадзіна зранку і гадзіна ўвечары ўсе стаяць, уся зона на вуліцы, незалежна ад таго, якое надвор'е».

Зняволеных водзяць у душ (так званая «лазня») адзін раз у тыдзень, працягласць душавых працэдураў абмежаваная 15–20 хвілінамі. На працягу гадзіны, выдзеленай на «лазню», зняволеным даводзіцца не толькі прымаць душ, але і праць асноўнае адзенне.

Фармальна пасля працоўнага дня на прамзоне таксама прадугледжваецца мыццё ў душы, аднак гэтая магчымасць часта блакуецца: людзей прымушаюць выконваць тэрміновыя працоўныя задачы замест гігіенічных працэдураў. Некаторыя спрабуюць абмыцца халоднай вадой з-пад крана ў ракавіне з выкарыстаннем смеццевага вядра, аднак падобныя дзеянні лічацца парушэннем і могуць пацягнуць дысцыплінарныя спагнанні.

«Час, які адводзіцца для душа, проста не даецца. Ты вымушаны брудным, мокрым працаваць да канца працоўнага дня. І такім ісці ў жылую зону. Многія мыюцца халоднай вадой, з крана на сябе льюць, але мыццё халоднай вадой — гэта таксама рэч, якая караецца».

«У цябе ёсць кавалак мыла, і цэлы тыдзень ты не ходзіш у душ. Калі ў камеры гарачыня, ты пастаянна пацееш. Набіралі ў гэтую сметніцу ваду і з яе... У прыбіральні распраналіся, намыльваліся і мыліся, калі хто хацеў».

Унутры атрада знаходзіцца так званая «ленінка» — пакой, у якім рэгулярна праводзяцца мерапрыемствы прапагандысцкага характару: чытаюцца лекцыі і дэманструюцца перадачы навінаў прапагандысцкіх тэлеканалаў. З-за дрэннай вентыляцыі людзям не хапае паветра. Зняволеныя павінны прысутнічаць, нягледзячы на стомленасць пасля працы, часта стоячы з-за недахопу месцаў.

«Быў абавязковы прагляд навінаў перад праверкай, з сямі да васьмі. Прыходзіш пасля прамзоны, вячэраеш, ідзеш глядзець прапаганду. Там нават месца мала, даводзіцца стаяць ці шукаць крэсла, несці са свайго сектара і слухаць».

Усім зняволеным выдаецца стандартны камплект **турэмнага адзення,** зімовыя і летнія наборы, якія практычна не адрозніваюцца па ўзроўні

цеплаізаляцыі. Якасць адзення вельмі нізкая: летам у ім горача, а зімой, наадварот, яно не абараняе ад холаду. Абутак жорсткі і моцна націрае ногі, можа стаць непрыдатным для выкарыстання ўжо ў першыя два тыдні.

«Яны давалі, здаецца, два наборы яшчэ ў каранціне, як належыць, сіні і чорны, але там быў вельмі-вельмі непрыемны сінтэтычны матэрыял. Ён не грэе, калі халодна, а ў спякоту ў ім немагчыма знаходзіцца, вельмі горача, быццам ён плавіцца. Чаравікі таксама давалі належныя, пару, яны былі жудаснай якасці, вельмі цвёрдыя, націралі. Я пахадзіў у іх літаральна тыдзень-два, і ў іх лопнула падэшва».

Змена летняга адзення на зімовую праводзіцца строга па календары, з-за чаго зняволеныя нярэдка застаюцца без цёплага адзення ў холад. Начальнік калоніі Пальчык забараняў насіць дадатковыя кашулі, а супрацоўнікі падчас праверак сачылі, каб асуджаныя не надзявалі цёплыя рэчы без дазволу. Выкарыстанне такога адзення лічылася парушэннем і каралася.

«На Наваполацку яны пастаянна пагражаюць, што нельга два споднія. Інакш на ШІЗА паедзеце. Я ўсё роўна насіў на свой страх і рызыку. Могуць праверыць, а могуць і не. Я лепш буду рызыкаваць, чым мерзнуць».

## Харчаванне ў калоніі

дужа мізэрнае і незбалансаванае: порцыі зрэзаныя да мінімуму, пераважаюць вугляводы пры вострым недахопе бялкоў, вітамінаў і мінералаў. Зняволеныя пастаянна адчуваюць голад, іх фізічны стан напрамую залежыць ад пасылак з прадуктамі ад сваякоў. Якасць ежы нізкая, нярэдка выдаюцца сапсаваная гародніна і практычна неядомыя рыбныя стравы, што прыводзіць да захворванняў страўнікава-кішачнага тракту. Адсутнасць пітной вады пагаршае сітуацыю, людзі выкарыстоўваюць для піцця ваду з-пад крана.

«Давалі ўсё згатаванае з гнілля: бульба, гародніна, якая захоўвалася там жа на зоне. Тое, што

захоўвалася дрэнна, гніла. Нягледзячы на гэта яго кідалі ў кацёл. Траплялiся і ачысткі».

У месцах пражывання зняволеных **рэгулярна праводзяцца вобшукі,** падчас якіх супрацоўнікі калоніі нярэдка дзейнічаюць без тлумачэння прычынаў і захавання парадку. Яны рвуць адзенне, ламаюць бытавыя прадметы ці забіраюць дазволеныя рэчы. Такія дзеянні выклікаюць у зняволеных адчуванне поўнай неабароненасці і бяссілля перад самавольствам.

«Яны могуць забраць рэчы, парваць, зламаць тваю асадку. Гэта ў парадку рэчаў».

# Карэспандэнцыя, пасылкі, атаварка, спатканні, званкі, адвакаты

«Чалец атрада кідаў ліст: “Ты чаго, дурань, не разумееш, што табе не дазволена пісаць іншым людзям?” Гэта вельмі моцны псіхалагічны ціск. Чалавек за кратамі і так знаходзіцца ў стане стрэсу. Сувязь з воляй — гэта тонкая нітачка, якая падсілкоўвае цябе, тваю псіхіку». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

На агульным рэжыме зняволеным дазволена[10] да чатырох пасылак і дзвюх бандэроляў у год, на ўзмоцненым — да трох пасылак і дзвюх бандэроляў. Вага адной пасылкі ці перадачы не павінна перавышаць 50 кг, бандэролі ці дробнага пакета — 2 кг. На практыцы гэтае права можа быць адмененае ў любы момант.

«Палітычных практычна заўсёды за нейкія парушэнні пазбаўлялі ці спаткання, ці пасылкі. І нікому ты там нічога даказваць не будзеш, бо інакш паедзеш на ШІЗА».

Права на набыццё тавараў першай неабходнасці рэалізуецца праз сістэму «атаварвання» з выкарыстаннем сродкаў на асабістым рахунку, ліміт складае да пяці базавых велічыняў у месяц, для «злосных парушальнікаў» рэжым змяншае яго да двух. Высокія цэны і абмежаваны асартымент робяць гэтыя сродкі недастатковымі. З 2021 года папаўненне рахунку стала магчымым толькі ад блізкіх сваякоў, што істотна абмежавала доступ зняволеных да неабходных тавараў.

«З моманту зняволення кожнаму зняволенаму ягоныя блізкія сваякі маглі пералічваць грошы на яго рахунак у турме. Гэтымі грашыма ён мог скарыстацца, набыць прадукты, нешта на атаварцы. Да лета 2021 года гэтыя грошы мог перавесці любы, а потым усё гэта пачало закрывацца, і [зрабіць перавод маглі] толькі сваякі.

[10] https://ik1mag.by/dopolnitelnaya-informaciya

Калі грошы пераводзіў не сваяк, праз пошту, напрыклад, ці праз АРІП, то гэтыя грошы ці вярталіся, ці ў некаторых выпадках, я так разумею, знікалі».

Працяглыя спатканні даюцца выбарачна і рэдка перавышаюць суткі. Іх колькасць за ўвесь тэрмін адбыцця звычайна абмяжоўваецца двума-трыма выпадкамі. Фактычна права на спатканні пераўтворанае ў інструмент ціску: тэрмін залежыць ад стаўлення адміністрацыі да зняволенага і можа вагацца ад аднаго да трох дзён. Атрыманне дазволу ўскладненае, а кароткатэрміновыя спатканні ў ПК-1 на месяцы былі прыпыненыя пад нагодай рамонту. Кароткатэрміновыя спатканні зрываюцца пад надуманымі падставамі, напрыклад, зняволенага змяшчалі ў ШІЗА менавіта ў тыя дні, калі чакаўся прыезд сваякоў.

«У ПК-1 паўгода ўвогуле не было кароткатэрміновых спатканняў. [Супрацоўнікі] спасылаліся на тое, што там ідзе рамонт».

Зняволеныя могуць атрымліваць лісты толькі ад абмежаванага кола сваякоў, пры гэтым адміністрацыя нярэдка адмаўляе ва ўручэнні нават карэспандэнцыі ад самай блізкай сям'і, адвольна абмяжоўваючы права на перапіску.

«Перапіска палітычным дазвалялася толькі з блізкімі сваякамі, прычым не проста з блізкімі, а з верыфікаванымі. Сваяк павінен быць верыфікаваны і ўхвалены па базе даных МУС».

У перыяд правядзення рэферэндуму па змяненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у 2022 годзе лісты ад блізкіх сваякоў і знаёмых практычна перасталі паступаць. Пасля зняволеныя назіралі, як мяшкі з такімі лістамі знішчаліся.

«Я бачыў, як неслі мяшкі з лістамі ў ЦЭЦ, дакладней, я бачыў мяшкі, а потым пайшоў пагаварыў з хлопцамі, спытаў, што спальвалі, яны сказалі — лісты».

Адміністрацыя калоніі актыўна перашкаджае падачы скаргаў на прысуд і дзеянні супрацоўнікаў, ствараючы адміністрацыйныя бар'еры, пры гэтым самі зняволеныя нярэдка адмаўляюцца ад зваротаў з-за страху ўзмацнення ціску.

«Адміністрацыяй вельмі негатыўна ўспрымаецца абскарджанне прысудаў, яны ўсімі шляхамі перашкаджалі напісанню скаргаў. Паскардзіцца пракурору нерэальна. Усё гэта прыйдзе начальніку калоніі, і потым фізічны і псіхалагічны ціск будзе ў некалькі разоў павялічаны».

Права на тэлефонныя званкі палітзняволеных строга рэгламентуецца адміністрацыяй і даецца вельмі абмежавана, звычайна адзін-два разы на месяц працягласцю да пяці хвілінаў. Няўдалая спроба злучэння выключае паўторны званок на працяглы час, званкі на альтэрнатыўныя нумары не дапускаюцца. Скаргі на абмежаванні разглядаюцца як парушэнне, выкарыстанне відэасувязі таксама абмежаванае.

«Усё залежала ад аператыўнага супрацоўніка. Хоча ён даць званкі з панскага пляча — дасць. Не хоча — не дасць. Прычым кароткачасовыя званкі былі максімум пяць хвілінаў. А калі ты, напрыклад, не датэлефанаваўся, ты не рэалізаваў сваё права на званок — і “да пабачэння”».

Доступ адвакатаў да палітычных зняволеных моцна абмежаваны фармальнымі перашкодамі. Канфідэнцыйнасць сустрэчаў не забяспечваецца, супрацоўнікі калоніі прысутнічаюць побач, кантралюючы размову і перашкаджаючы перадачы скаргаў ці інфармацыі пра парушэнні.

«Да мяне прыйшоў адвакат аднойчы, калі я быў у ізалятары. Дзіўна, што пусцілі, бо ў мяне не была падпісаная заява. Мяне вывелі, але не дазволілі застацца з ім сам-насам. Мяне атачыла, напэўна, сем супрацоўнікаў. Яны проста стаялі побач і слухалі, што я гавару. Кантралявалі, каб я не сказаў нічога лішняга ці каб мне не сказалі».

# Праца ў ПК-1

«Пастаянна камусьці дзесьці прылятае які-небудзь аскепак ад берваяна ці яшчэ што. Ведаю хлопца, які расказваў, як сабе рассек нагу сякерай. Хтосьці палец пашкодзіў, рубануўў». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Праца ў ПК-1 носіць абавязковы характар. Працоўны тыдзень уключае пяць працоўных дзён[11], пры гэтым агульная працягласць працоўнага часу складае каля 8,5 гадзінаў у дзень. Працоўныя змены дзеляцца на ранішнюю і дзённую з 9:00 да 12:00 і з 13:00 да 17:30 гадзінаў адпаведна. Такі графік не ўлічвае фізіялагічных патрэбаў зняволеных і не прадугледжвае дастаткова часу для аднаўлення сілаў. Палітзняволеныя часта прыцягваюцца да працы па выходных днях і дзяржаўных святах.

«Працы было вельмі шмат. Бывала, пасля цэлага дня на прамзоне прыходзіш у атрад, і, паколькі ты палітычны, табе яшчэ трэба ўвечары снег панасіць, або смецце павыносіць, або з будоўлі бут павыцягваць. То бок пасля працы яшчэ праца».

«Вельмі цяжкая праца шэсць дзён на тыдзень. І так ва ўсіх палітычных. Ці гэта ачыстка кабеляў, ці пераборка смецця. Ставілі на самую цяжкую брудную працу, каб не было вольнага часу, каб ні павучыцца, ні папісаць лістоў, ні пачытаць».

У ПК-1 зняволеных прыцягваюць да дрэва- і металаапрацоўкі, перапрацоўкі пластыка, выпуску плёнкі, мыла, хлеба і вугалю, а таксама да пашыву формы для дзяржструктураў. Многія цэхі характарызуюцца цяжкімі ўмовамі: перапрацоўка пластыка звязаная з таксічнымі выпарэннямі, а вытворчасць вугалю — з пастаянным уздзеяннем вугальнага пылу і прадуктаў гарэння. Палітзняволеных, як правіла, размяркоўваюць на найбольш цяжкія і шкодныя ўчасткі, незалежна ад іх кваліфікацыі ці медыцынскіх абмежаванняў.

[11] Па ўказанні начальніка калоніі А. Пальчыка ў палітычных зняволеных быў шасцідзённы працоўны тыдзень.

Адным з відаў працы для палітзняволеных з'яўляецца пераборка поліэтыленавых адкідаў — пастаянны кантакт з дробным пылам пашкоджвае скуру і дыхальныя шляхі. Пры рэдкіх праверках кіраўніцтва хавае сляды, хаваючы матэрыялы і інструменты пад маркай сакрэтнасці.

«...падымалася так шмат поліэтыленавага пылу, што наверсе ўжо было мутна, нібы задымлена. І калі там знаходзішся, гэта ўсё трапляе ў лёгкія. У мяне быў такі досвед: я дзень пахадзіў, папрацаваў і потым высмаркаўся — быццам вугалем, быццам я ў шахце быў. У іншы дзень я ўзяў медыцынскую маску, каб не дыхаць гэтым усім. Я пахадзіў у гэтай масцы літаральна гадзіну-дзве, і на ўзроўні носа ўтварылася чорная пляма. Было відаць, наколькі паветра бруднае».

Іншым тыпам такой працы з'яўляецца дрэваапрацоўка. Асуджаныя ўручную перамяшчаюць цяжкія дошкі і бярвенне пад адкрытым небам. Праца вядзецца як у мароз, так і пад пякучым сонцам. Палітычным зняволеным даручаюцца заданні з відавочнымі прыкметамі шкоднасці, такія як апрацоўка гнілой драўніны хімічнымі рэчывамі.

«Наш атрад перавялі на дрэваапрацоўку дапаможнымі працоўнымі. Мы ўвесь час павінны былі знаходзіцца на вуліцы. Тады былі вельмі вялікія маразы. Нам сказалі, што нікуды зайсці і пагрэцца нельга. Калі зловяць — будзе рапарт. Гэта было цяжка, бо абутак, па сутнасці, летні. Людзі надзявалі па двое, па трое шкарпэтак, каб неяк сагрэцца».

Таксама зняволеныя вырабляюць паддоны і скрыні, у тым ліку для захоўвання мінаў, снарадаў, авіябомбаў і ракетаў. Замовы паступаюць ад прадпрыемстваў абароннай прамысловасці, што робіць зону часткай вайсковай лагістыкі. Да працы прыцягваюць усіх, у тым ліку палітзняволеных.

«На складзе ляжаць розныя ўзоры. Я ў войску служыў, магу зразумець, што гэта скрыні для мінаў і

> снарадаў... і скрыні, як я разумею, танкавыя. Для авіябомбаў — таму што цыліндр зроблены з секцый, а ўнутры зменлівыя дыяметры, каб нешта ўкласці. Толькі авіябомбы падыходзяць. І яшчэ рабілі нешта падобнае на скрыні пад ракеты... СЗА, таму што тубусы вельмі доўгія, туды некалькі штук можна ўкласці».

Трэці від працы для палітзняволеных — утылізацыя кабеляў і адкідаў. Практыка спальвання ізаляцыі, гумы і спісанай ваеннай маёмасці вядзе да выкідаў свінцу і іншых таксічных злучэнняў, а дым дасягае жылых карпусоў. Адсутнасць сродкаў абароны робіць такую працу прамой пагрозай для здароўя і жыцця.

> «Прывозілі кабель у поліэтыленавай аплётцы, у пластыкавай. Яны іх пілавалі, seклі, палілі. Слуп чорнага дыму па ўсёй зоне, у вокны ляцеў, паўсюль. Мала таго, што два хімічныя прадпрыемствы з аднаго і іншага боку былі, дык яшчэ палілі гэтую пластыкавую аплётку, якая давала едкі дым. Таксама палілі ўсё смецце, нават прывезлі супрацьгазы вайсковыя. Над “промкай” стаяў чорны дым паленай гумы».

У калоніі таксама практыкуюцца розныя віды прымусовай неаплатнай працы, якія ажыццяўляюцца пад выглядам гаспадарчай дзейнасці. Адным з рэгулярных фарматаў з'яўляюцца парка-гаспадарчыя дні (ПГД), якія ўяўлялі сабой генеральнае прыбіранне. ПГД праводзіліся як мінімум раз у тыдзень, нярэдка пасля адбою.

Апроч ПГД існуе сістэма штодзённага «кантраляванага» прыбірання, абавязковага як удзень, так і ўвечары. Зранку і на працягу дня зняволеныя прыбіраюць вулічную тэрыторыю, а ўвечары пасля адбою — унутраныя памяшканні.

> «Паколькі ўвесь дзень распісаны на працу, на розныя праверкі, то прыбіранні давалі ў асноўным начныя. І нас, палітычных, ганялі на гэтыя прыбіранні. Было вельмі-вельмі шмат прыбірання.

Даюць адбой, а ты ідзеш прыбіраць лесвіцу, калідор, рукамыйнікі».

Парушэнні ўнутранага распарадку, спазненні ці ігнараванне графіка могуць прывесці да дадатковага «пакарання» ў выглядзе працы «на мятле» — прымусовай прыборкі, якая фармальна выступае як дзяжурства. Такія «дзяжурствы» праводзяцца пасля асноўнай працы і істотна скарачаюць асабісты час, асабліва ў тых, хто раней ужо адбываў дысцыплінарныя пакаранні.

«Ты ідзеш на вячэру, і яшчэ “мётлы” застаецца недзе хвілінаў 30–40. Цябе кантралююць: там паўсюль стаяць камеры, і да цябе прыстаўлены чалавек, які ў сваім нататніку запісвае, калі ты выйшаў на гэтую “мятлу” і калі сышоў. Калі ты гэта парушаеш, табе зноў ШІЗА».

Сезонная праца таксама ўключаецца ў агульны парадак. Зімой у раннія ранішнія гадзіны да пад’ёму і на працягу дня зняволеныя прыбіраюць снег з лакальных участкаў, збіраючы яго ў мяшкі і выносячы на адмысловыя пляцоўкі. У перыяд дажджоў у тыя ж часавыя прамежкі праводзяцца прыбіранне лужынаў ці збор лістоты. Для такой працы, асабліва па выходных, часта прыцягваюцца палітычныя зняволеныя.

«Снег, калі снегапад, прыбіралі ўсе зняволеныя. Усе, хто не ляжачыя, выходзілі і цягалі снег у мяшках. Я, калі ўбачыў гэтую гару снегу, ніколі б не паверыў, што людзі могуць столькі нацягаць. Гара метраў 6 у вышыню, метраў 10 у шырыню і метраў 100 у даўжыню».

Асобным элементам працоўнага рэжыму з'яўляецца практыка «двайных пакаранняў» — пасля выхаду з ШІЗА зняволеным могуць прызначаць месяц штодзённай «мятлы» ці іншых абавязкаў прыбірацца ў дадатак да стандартных графікаў.

«Ёсць так званая практыка двайных пакаранняў. Гэта калі ўсе людзі, якія пабывалі ў ШІЗА, па выхадзе

яшчэ атрымліваюць, напрыклад, месяц “мятлы”».

У ПК-1 захаванне тэхнікі бяспекі на працоўных месцах носіць фармальны характар і фактычна адсутнічае. Асуджаныя не праходзяць паўнавартаснага інструктажу, сродкі індывідуальнай абароны практычна не выдаюцца, абсталяванне часта знаходзіцца ў няспраўным стане. Транспартныя сродкі ўяўляюць сабой самаробныя тачкі, сабраныя з металалому. Былі зафіксаваныя выпадкі, калі зняволеным выдаецца працоўнае адзенне і абутак, якія не адпавядаюць памеру і не прыдатныя да выкарыстання.

«Мне сказалі, што робу дадуць тыдні праз два-тры. Я кажу: “А што мне рабіць?” Яны кажуць: “Ну, глядзі сам. Калі ты не будзеш працаваць, табе будуць акты, ты зноў паедзеш у ШІЗА”. Мне знайшлі брудную, парваную робу, якую ўжо збіраліся выкідваць. І мне давялося ў ёй працаваць».

«Мне выдалі робу, якая была памераў на пяць меншая. Яна на мяне проста не налазіла. І сказалі, што больш ніякіх няма, хочаш — насі гэтую, хочаш — не насі. Тое ж самае з чаравікамі было: далі тыя, якія не налазяць. “Адмаўляешся атрымліваць? Мы зафіксуем, будзе акт, што ты адмаўляешся ўзяць працоўнае адзенне”».

Парушэнні правілаў бяспекі з'яўляюцца сістэматычнымі і нярэдка прыводзяць да траўмаў. Сур'ёзныя траўмы здараюцца пры працы са станкамі і інструментамі, адбываюцца парэзы пальцаў, параненні сякерамі, трапленне аскепкаў у вочы, удары па галаве цяжкімі прадметамі. Многія зняволеныя пазбягаюць паведамляць пра здарэнні, асцерагаючыся абвінавачанняў у наўмысным самакалецтве.

«Бервяно скацілася хутка, чалавек не паспеў прыбраць нагу, яму дыскам па назе праехала цяжкая каталка і зламала ступню. Яшчэ хлопец быў палітычны, ён дровы калоў, з 10-га атрада. Ён махнуў сякерай, прамазаў і сабе па назе даў. Яшчэ адзін хлопец лез нешта рабіць па электрыцы ў

станок, яму токам дало па пальцах. Хадзіў потым месяцы два ў бінтах».

Тэмпературны рэжым у цэхах вельмі неспрыяльны: у мылаварачных і хлебапякарных цэхах вельмі горача, у той час як у цэхах з адчыненымі брамамі і на вуліцы халодна, асабліва ў міжсезонне. За спробы сагрэцца ці адпачыць па-за ўсталяваным часам зняволеных змяшчаюць у ШІЗА.

«Вельмі горача на мылаварцы, вельмі горача на хлебапечцы. Калі Бабарыка там працаваў, было відаць, як ён выходзіць падыхаць на паветра, таму што вельмі горача. Вельмі халодна ў цэхах, у якіх пастаянна брама адчыненая».

Паводле дадзеных былых зняволеных, заробак складае ад 3 да 7 рублёў у месяц. Пры гэтым многія зняволеныя сцвярджалі, што іх заробак быў каля 60–80 капеек у месяц пасля ўсіх адміністрацыйных вылікаў. Зняволеным плацяць значна менш за ўсталяваную мінімальную аплату працы, спасылаючыся на ўтрыманні за бытавыя выдаткі.

«Па вялікім рахунку гэта была рабская праца. Я за тры месяцы аплаты нават на запальнічку не зарабіў. У месяц 60 капеек. Я паглядзеў разліковы за тры месяцы, у мяне 2 рублі атрымалася».

«На прамзоне сярэдняя зарплата — гэта 1 рубель, 1,20 рублёўу месяц прыблізна».

# Нефармальная турэмная іерархія

> «Турма пабудаваная па прынцыпе вайсковай часткі. У плане іерархіі — вельмі зручна. Начальнік атрада — гэта камбат па сваіх функцыях, прыкладна як капітан, лейтэнант, а зэкі, якія знаходзяцца ў яго на пасадах, – гэта, па сутнасці, сяржанцкі склад. Калі так іерархію разумець, проста калька». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

«Дзясятка» да 2010 года лічылася так званай «чорнай зонай», дзе жылі «па паняццях»: тут сядзелі «вартавыя» і «злодзеі ў законе».[12]

Аднак са з'яўленнем у калоніі пасля выбараў прэзідэнта ў 2010 годзе апанентаў рэжыму Лукашэнкі (Андрэй Саннікаў, Ігар Аліневіч, Мікіта Ліхавід, Алесь Кіркевіч) калонія перайшла пад кіраванне адміністрацыі (стала «чырвонай»), прычым у вельмі жорсткім рэжыме.

> «Наваполацкая калонія №1 лічыцца самай “чырвонай”, самай рэжымнай і строгай. Любое парушэнне адразу фіксуецца. Усе пад міліцыяй ходзяць. І лепш за ўсіх там сябе адчуваюць актывісты, якія працуюць на адміністрацыю, усе астатнія ўпахваюць. То бок той, хто не падлюга, — той там і пакутуе па вялікім рахунку».

Дамінуе ў калоніі яе кіраўніцтва, якое, з аднаго боку, выкарыстоўвае працэсуальна-выканаўчае заканадаўства і іншыя нормы ўтрымання ў папраўчай установе, а з іншага — падтрымлівае нефармальную іерархію. Як і ў іншых калоніях Беларусі, уся маса зняволеных дзеліцца на тых, хто супрацоўнічае з адміністрацыяй (т.зв. «казлы» — загадчыкі гаспадаркі, старэйшыя па атрадзе, брыгадзіры), і тых, хто не супрацоўнічае («мужыкі» — асноўная маса і НСС).[13]

---

[12] https://www.svaboda.org/a/32826995.html

[13] Больш падрабязна пра дзяленне зняволеных на касты ў калоніях і турмах можна прачытаць у раздзеле «Нефармальная турэмная іерархія» ў расследаванні «Катаванні і жорсткае абыходжанне ў Папраўчай калоніі №17 г. Шклова», ст. 26–29: https://torturesbelarus2020.org/pytki_ik_17

Пачынаючы з каранціну, а потым і пры знаходжанні зняволеных у атрадах частку функцый супрацоўнікаў установы выконваюць «казлы».

> «На каранціне гэтыя актывісты — зэкі, якія супрацоўнічаюць з адміністрацыяй, —яны там нават горшыя за супрацоўнікаў. Калі я прыехаў, былі снегапады. Нас будзілі ў чатыры раніцы, каб снег расчышчаць».

У каранціне асноўны кругласуткавы кантроль за зняволенымі ажыццяўляюць старэйшыя атрада. У гэтую ж катэгорыю ўваходзяць сакратар атрада і днявальныя. Па аповедах зняволеных, многія з іх у самой зоне наогул не былі па розных прычынах, і пераход у зону для іх непажаданы. У каранціне пакідаюць два тыпы людзей: або тых, якія гатовыя на ўсё дзеля таго, каб атрымаць УДВ ці замену рэжыму, або асуджаных за сексуалізаваныя злачынствы, якія баяцца стаць «нізкім статусам»унутры калоніі.

> «Я ведаю, што сакратар... у яго была нейкая сексуальная сувязь з непаўнагадовымі, зыходзячы з нумара артыкула. Ён вельмі доўгі час быў адным з людзей, якія былі на каранціне, і кажуць, што ён складаў нейкія там пісулі, запісы мянтам».

Таксама ў калоніі ёсць больш-менш «прэстыжныя» пасады, якія даюць іх уласнікам некаторыя прывілеі і паслабленні рэжыму: бібліятэкар, медбраты, раздатчыкі ежы ў сталоўцы, загадчыкі гаспадаркі медчасткі, тэхнікума, сантэхнікі, днявальныя пакоя спатканняў.

> «1-шы і 2-гі атрады, якія асобна знаходзяцца, — там усе зэкі не на прамзоне, а на якіх-небудзь бытавых паслугах па калоніі. Гэта, умоўна кажучы, бібліятэкар — вельмі крутая пасада. У медчастцы — медбраты ці загадчык гаспадаркі медчасткі. Днявальныя пакоя спатканняў. Такія прасунутыя пасады, якія шмат чаго дазваляюць».

У функцыі заггаса, акрамя афіцыйных, уваходзяць ажыццяўленне «ўгодаў» паміж зняволенымі і актывістамі, збор «абшчаку».

> «Раз у месяц кожны зэк здае за паслугі пэўную колькасць цыгарэтаў — тры пачкі. Гэтыя тры пачкі размяркоўваюцца паміж тымі зэкамі, якія загадчык гаспадаркі, днявальныя, днявальныя пакоя захоўвання асабістых рэчаў,— за іх працу».

«Нізкі статус» таксама атрымлівае з падаткаў некалькі пачкаў за тое, што прыбірае прыбіральні. Ёсць у гэтай схеме і іншыя нефармальныя ўгоды. Напрыклад, пашыць сабе штосьці на прамзоне, адрамантаваць абутак. Фактычна, цыгарэты ў калоніі выконваюць функцыю валюты.

> «Напрыклад, за тры пачкі цыгарэт мне перашылі абутак».

Большасць зняволеных імкнецца адбываць тэрмін нейтральна, так званымі «мужыкамі»: ходзяць на працу, імкнуцца не прыцягваць да сябе ўвагу.

Іншая частка зняволеных разумее, што пры ўзаемадзеянні з адміністрацыяй шанцы атрымаць умоўна-датэрміновае вызваленне ці замену рэжыму істотна ўзрастаюць. Менавіта яны імкнуцца патрапіць у катэгорыю актывістаў.

> «Усе людзі, якія трапляюць у такі актыў, у той ці іншай меры супрацоўнічаюць з адміністрацыяй».

Як расказваюць зняволеныя, да 2020 года людзі, асуджаныя па наркаартыкулах, знаходзіліся ва ўмовах, набліжаных да тых, у якіх цяпер адбываюць тэрмін палітычныя зняволеныя: прыкладна так жа дыскрымінаваліся і з такімі ж праблемамі. У 2020 годзе шмат што ў сістэме калоніі стала мяняцца. З'явілася вялікая колькасць палітзняволеных, і да асуджаных па наркаартыкулах пачалі ставіцца нашмат лаяльней, іх пачалі дапускаць да пасадаў. А улічваючы, што наркаартыкулы маюць вялікія тэрміны, адзіны шлях выйсці хутчэй на волю — гэта атрымаць магчымасць УДВ ці замены рэжыму на больш лёгкі.

> «Гэта ў першую чаргу ўпіраецца не столькі ў фармальныя крытэры, колькі ў нефармальныя.

Падчас атэстацыяў патрэбныя характарыстыкі, каб міліцыянты ўяўлялі, што ты цвёрда стаў на шлях выпраўлення. Улічваючы, як выпісваюцца парушэнні, маніпуляваць гэтым вельмі проста. Даў парушэнне, даў другое, зрабіў “злоснікам”».

Пачынаюць «кар’еру» звычайна з днявальнага. Калі зняволены спадабаўся адміністрацыі, яго могуць падвышаць далей. Гэта істотна дапамагае ў атрыманні добрых характарыстык, прасоўванні па лесвіцах актыву. Многія асуджаныя па наркаартыкулах дзякуючы гэтаму выходзяць на волю значна раней за першапачатковы тэрмін.

«З пункту гледжання асабістай выгады тут усё відавочна. Але іншым людзям зразумела: з-за тых умоваў, якія яны ствараюць і якія негатыўна ўплываюць на здароўе і ўсё астатняе, яны з'яўляюцца фактычна праваднікамі гэтага беззаконня з боку мянтоў».

Дадатковыя прывілеі для актывістаў — гэта розныя формы заахвочвання, напрыклад, дадатковае доўгатэрміновае спатканне да трох сутак, пазачарговая пасылка. За кошт такіх пераваг актывісты жывуць значна камфортней за іншых зняволеных.

# «Нізкі сацыяльны статус» — дадатковы рычаг ціску на зняволеных

Усталяванне і падтрыманне сацыяльных межаў паміж зняволенымі пачынаецца супрацоўнікамі калоніі адразу пасля прыбыцця, а ў далейшым знаходжанні ў калоніі гэта з'яўляецца магутным інструментам адміністрацыі ва ўзаемаадносінах са зняволенымі. Адміністрацыя тут мае свае мэты: стварэнне ўнутранай напружанасці ў калоніі; прадухіленне непажаданых камунікацый паміж зняволенымі, асабліва з палітычнымі; псіхалагічны ціск і магчымасць маніпуляваць дзеяннямі зняволенага з-за страху патрапіць у катэгорыю з «нізкім сацыяльным статусам» (НСС)[14].

> «Калі чалавек асуджаны за згвалтаванне, то, у асноўным, па такіх артыкулах пераводзяць у больш “нізкі сацыяльны статус”. Але не ўсіх. Калі ў кагосьці ёсць грошы, ён можа адкупіцца. А калі ў кагосьці іх няма — ну і ўсё, ідзі прыбіраць прыбіральні».

Па прыбыцці ў калонію менавіта супрацоўнікі ўстановы вызначаюць, у якім статусе будзе знаходзіцца канкрэтны зняволены.

> «Гэта вырашае адміністрацыя, хто ў якім статусе знаходзіцца. Нягледзячы на тое, што гэта субкультура зняволеных. Яны, вядома, грунтуюцца на прысудзе. Злачынствы гвалтоўнага характару супраць малагадовых, серыйныя згвалтаванні, гомасексуальныя сувязі».

Аднак і ў гэтым няпісаным правіле ёсць выключэнні. «Дамовіцца» можна за грошы ці пайсці на поўнае супрацоўніцтва з адміністрацыяй.

> «Ёсць людзі, якія па такіх жа артыкулах не знаходзяцца ў гэтым статусе. І, як правіла, гэта людзі,

[14] Больш пра «нізкі сацыяльны статус» у калоніях і турмах можна прачытаць у раздзеле «Нефармальная турэмная іерархія» ў расследаванні «Катаванні і жорсткае абыходжанне ў Папраўчай калоніі №17 г. Шклова», ст. 26–29: https://torturesbelarus2020.org/pytki_ik_17

якія працуюць на адміністрацыю».

«Ён у “мужыках” ходзіць, таму што яго мамка нармальна грошай закідвае на рахункі калоній. Таму яго не чапаюць».

Іншая катэгорыя зняволеных з НСС — гэта людзі, якія да пазбаўлення волі злоўжывалі алкаголем, здабывалі ежу на сметніках (т.зв. «чэрці»). Яны трапляюць туды, бо парушаюць «зонаўскі» сацыяльны этыкет. Звычайна яны пачынаюць з ролі «адсаджаных», то бок людзей, якія проста не сядзяць за агульным сталом падчас прыёму ежы. Ёсць таксама ў НСС людзі з псіхічнымі праблемамі. Трэцяя група — гэта асобы, якія належаць да ЛГБТК+ супольнасці.

Каб не патрапіць у гэтую зневажальную катэгорыю, зняволеныя не павінны вітацца з НСС, штосьці браць у іх, мыцца ў адным памяшканні. Нельга ўжываць да іх любы гвалт, пакрыўдзіць нават словам, таму што ў адказ такі чалавек можа проста падысці і абняць — і зняволены аўтаматычна атрымлівае такі статус. Змываеш за сабой у прыбіральні — атрымліваеш НСС, таму што «мужыкі за сабой не змываюць».[15]

«Там існуюць унутраныя крымінальныя правілы. Хочаш, не хочаш, але некаторых правілаў ты павінен прытрымлівацца, таму што інакш ты дыскрэдытуеш сябе. Гэта можа скончыцца вельмі сумна. Такое правіла заведзенае, што ўсе санвузлы прыбіраюць людзі, якіх называюць “пеўнямі”; у афіцыйных дакументах яны называюцца “людзі з нізкай сацыяльнай адказнасцю”».

Менавіта правіламі «зонаўскай» субкультуры карыстаюцца супрацоўнікі калоніі, калі адміністрацыя з нейкіх сваіх прычынаў вырашае перавесці зняволенага ў НСС. Зняволенага вымушаюць выконваць тую працу, якую не выконваюць «мужыкі», — мыць прыбіральні.

«“Нізкі статус” у любым атрадзе займаецца мыццём прыбіральняў. І ўсе гэтыя людзі ў аператыўніка падпісваюць паперу пра тое, што яны добраахвотна

[15] https://news.zerkalo.io/life/54097.html

згодныя выконваць працу па прыбіранні атрада. Такім чынам, дзяржава бярэ на сябе адказнасць за гэты прыгнёт на сто адсоткаў. Таму што не ўсе людзі, якія здзейснілі сексуалізаваны гвалт, трапляюць у “нізкі статус”, але ўсе людзі з “нізкім статусам” падпісваюць такую паперу. Такім чынам, менавіта дзяржава з'яўляецца той асобай, якая іх робіць “нізкім статусам”».

«Калі звычайны зэк гэта будзе рабіць, то яго аўтаматычна павінны перавесці ў “нізкі сацыяльны статус”. На гэта ніхто не гатовы, і на гэта ніхто не пойдзе. Гэта мяжа, якую нельга перайсці».

Па такой ужо адпрацаванай схеме дзейнічаюць супрацоўнікі калоніі, калі адміністрацыя вырашае адправіць зняволенага/палітзняволенага ў ШІЗА/ПКТ без асаблівых на тое прычынаў.

**Зняволенаму прызначаецца прыбіранне санвузла**

↓

**Зняволены на камеру адмаўляецца ад прыбірання**

↓

**Зняволенаму выпісваецца парушэнне**

↓

**Зняволены змяшчаецца ў ШІЗА / ПКТ.**

Такая працэдура можа паўтарацца некалькі разоў, асабліва ў дачыненні да палітзняволеных.

> «Калі я выйшаў з ШІЗА, мяне не выпусцілі нават у атрад. Прыходзіў аператыўнік, вадзіў мяне ў санвузел на прыбіральні, мяняў графік прыбірання, каб у гэты дзень менавіта я прыбіраўся. Паколькі гэта можа змяніць твой сацыяльны статус у гэтым турэмным асяроддзі, ты адмаўляешся. Гэта фіксуецца на камеру, і цябе адразу зноў кідаюць у ШІЗА. Так яны рабілі чатыры разы. У выніку я адсядзеў у ізалятары, напэўна, 57 ці 58 дзён».

## Псіхалагічны і фізічны гвалт у дачыненні да асобаў НСС у ПК-1.

Зыходзячы з «зонаўскага» правіла «Кулак па зоне не ходзіць», фізічны гвалт у калоніі забаронены, і правіла гэта павінна распаўсюджвацца на ўсіх. Гэтага прынцыпу абавязаныя прытрымлівацца ў першую чаргу супрацоўнікі ўстановы як праваднікі гэтага правіла.

> «Калі недзе “пеўня” штурхнуць, зразумела, што ўсе заплюшчаць вочы. Але калі яго рэальна ўдарыць, то праблемы будуць, як і з усімі іншымі. Да таго ж, многія “пеўні”, зноў жа, стукачы. Іх крыху баяцца, таму што яны могуць даносіць».

Нягледзячы на гэтыя правілы, па аповедах былых зняволеных, асобаў «нізкага сацыяльнага статусу» ў ПК-1 нярэдка збівалі самі супрацоўнікі ўстановы.

> «Збівалі гэты “нізкі сацыяльны статус” самі супрацоўнікі адміністрацыі. У іх такі метад, можа, прафілактычны, ці яны атрымлівалі нейкае задавальненне... Кожны дзень аднаго маладога хлопца, 26-гадовага, выводзілі на зборны і расцягвалі да такой ступені, што ён прыходзіў да нас на каранцін з амаль чорнымі нагамі. Збівалі яго дубінкамі і нагамі».

З пункту гледжання зняволеных, супрацоўнікі ПК-1 ставяцца да НСС крыху лаяльней, чым да іншых, даючы ім магчымасць выконваць іх асноўную працу і захоўваць асноўныя правілы субкультуры і не чапляючыся да іх без асаблівых падставаў.

> «Папраўчая калонія №1 паміж зэкамі называецца "пеўневы рай", у простанароддзі. Таму што людзям у "нізкім статусе" там шмат у чым жыць прасцей, чым звычайным зэкам, з-за такога ўзроўню сарамлівасці мянтоў».

Зняволеныя расказваюць, што з-за створанай у ПК-1 несправядлівай сістэмы адносінаў і жорсткага абыходжання са зняволенымі, асабліва з палітзняволенымі з вялікімі тэрмінамі пакарання, яны назіралі выпадкі добраахвотнага пераходу зняволеных у НСС.

> «...І не будзе сутыкацца з нейкімі праблемамі ў далейшым... То бок, са звычайным "нізкім статусам" большасць людзей не моцна камунікуе, але, напрыклад, з нашымі палітычнымі мы намагаліся пабалбатаць».

# Палітычныя зняволеныя: жоўтыя біркі, 6-дзённы працоўны тыдзень і асаблівы рэжым утрымання

«Гэта канцлагер — канцэнтрацыя палітычных там вельмі высокая. Калі я прыехаў, там было ад 25 да 35 адсоткаў палітычных зняволеных». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Да палітычных зняволеных у Наваполацкай калоніі ў адміністрацыі, так жа як і ў іншых папраўчых установах краіны, стаўленне жорсткае і неадэкватнае. Відавочна, што дзейнічаюць супрацоўнікі зыходзячы з загадаў і ўстановак Дэпартамента выканання пакаранняў Рэспублікі Беларусь і іншых сілавых установаў.

«Гэтыя супрацоўнікі, выхаваныя Пальчыкам, вельмі жорсткія і адрываліся па максімуме, хто як мог і хто як хацеў. Першыя хлопцы, якія туды заехалі, пацярпелі вельмі моцна. Бо іх было мала».

Першае візуальнае адрозненне палітзняволеных ад іншых, хто адбывае пакаранне ў калоніі, — гэта наяўнасць жоўтых, а часам і чырвоных бірак на адзенні. Атрымліваюць такую пазнаку палітзняволеныя ўжо ў Следчым ізалятары.

«У першую чаргу прафулік — гэта пільная ўвага ад супрацоўнікаў. Ты заўсёды сядзіш у першых шэрагах, тры разы на дзень трэба адзначацца ў пэўным месцы ў пэўны час. Калі ты спазніўся, то гэта парушэнне. Ну і, скажам, дзясяты прафулік — мы тэлефанавалі асобна, званкі ў нас былі радзей».

Асноўная задача супрацоўнікаў у калоніі —пагоршыць жыццё зняволеных. Для палітычных усё ў два разы складаней.

«“Злоснікі” — у асноўным палітычныя зняволеныя. Гэта тыя, хто катаецца па ШІЗА, у якіх абрэзаная атаварка ў краме не больш за дзве базавыя. Часам і спатканне забіраюць. Хто на што здольны, да кожнага індывідуальнае стаўленне, да кагосьці больш жорсткае, камусьці мякчэйшае».

Самыя распаўсюджаныя прафулікі для палітзняволеных— гэта 3-ці[16] і 10-ты[17]. Уладальнікі жоўтых бірак — прафулікі — тройчы ў дзень у любое надвор'е абавязаныя стаць для дадатковай праверкі па прозвішчах. Адзіны дзень, калі такая праверка не праводзіцца, — нядзеля.

«Яшчэ горш было становішча ў чырвонабірачнікаў. Гэта людзі, схільныя да ўцёкаў, іх было два ці тры чалавекі ў зоне. Хаця ніякіх уцёкаў яны не рабілі. І вось яны хадзілі кожную гадзіну на праверку».

З папулярных прафулікаў у калоніі — схільнасць да суіцыду.

«Людзі, якія спрабавалі ўскрыць сабе вены, носяць такі прафулік. Хто спрабаваў павесіцца, хто выказваў уголас нейкія суіцыдальныя думкі і не раз, таксама носяць такі прафулік».

Здзейсніць суіцыд у ШІЗА гэтай установы спрабаваў і экс-палітзняволены Аляксандр Кабанаў. Ён расказваў, што яго тройчы адпраўлялі ў ШІЗА. У апошні раз умовы ў камеры аказаліся такімі, што мужчына не вытрымаў і станком брытвы парэзаў вены. Яму наклалі 68 швоў.[18]

«Яшчэ да прыезду туды разумеў, што гэта за месца. Падчас этапаў я размаўляў з людзьмі, якія ўжо пабывалі ў калоніях. Пра “адзінку” хадзілі самыя змрочныя чуткі. Казалі, там увогуле трэшак. Калі я

[16] 3-ці прафулік — схільны да захопу закладнікаў, праявы агрэсіі і нападу на супрацоўнікаў адміністрацыі.
[17] 10-ты прафулік — схільны да экстрэмізму і іншай дэструктыўнай дзейнасці.
[18] https://news.zerkalo.io/life/34986.html

толькі туды прыехаў, на мяне адразу ж склалі акт за расшпіленыя гузікі. За ім у той жа дзень пайшоў другі: нібыта колькасць фотаздымкаў, якія ў мяне былі, не адпавядае заяўленаму ў вопісе. Потым мяне паставілі мыць унітазы. я адмовіўся — і мяне на месяц закрылі ў ШІЗА ў адзіночцы».

Што тычыцца іншых абмежаванняў і забаронаў, то навучанне ў тэхнікуме таксама недапушчальнае для палітзняволеных.

«Таму што, умоўна кажучы, калі ў вас 15% палітычных, значыць, у вас вельмі маленькі выбар... Дзеду ўжо пад 60, а яго прымушалі ісці вучыцца, каб выканаць план».

Доступ палітзняволеных у храм то акдрывалі, то закрывалі. Асноўнымі «забавамі» для палітзняволеных застаюцца фізічныя практыкаванні, чытанне кніг, прагляд прапагандысцкіх перадачаў у ленінскім пакоі.

«Ёсць конкурсы кшталту “Мы шукаем таленты”. Палітычных туды не бяруць. Асноўная забаўка — гэта турнікі, брусы ўнутры лакальнага ўчастка, кніжка, ёсць “ленінка”, дзе працуе тэлевізар. Ну і проста сядзець, гарбату піць».

Як правіла, ужо з каранціну палітзняволеныя выходзяць з адным-двума парушэннямі. Часам яны могуць атрымаць адразу тры парушэнні, у сувязі з чым аўтаматычна становяцца «злоснікамі» і трапляюць у ШІЗА.

«Гэта адбываецца для таго, каб зрабіць “злоснікам”; трэба або тры любыя парушэнні, або два, калі адно з іх — ШІЗА».

Стаўленне да палітзняволеных у ШІЗА мала чым адрозніваецца ад стаўлення да іншых зняволеных — само знаходжанне там раўназначнае

жорсткаму, прынізліваму для чалавечай годнасці абыходжанню.[19] Палітычныя зняволеныя змяшчаюцца туды нашмат часцей і на больш працяглы тэрмін. Шмат каго з іх пасля шматлікіх ШІЗА / ПКТ адпраўляюць на змену рэжыму ўтрымання і пераводзяць у крытую турму.

> «Тут хутчэй уплывала асабістае стаўленне. Хтосьці з палітычных больш адстойваў свае межы, хтосьці менш, таму камусьці маглі з-за гэтага наліць больш хлоркі. То бок, самае галоўнае прадузятае стаўленне — гэта тое, што нас часцей адпраўлялі ў ШІЗА, чым іншых».

Апытаныя зняволеныя сцвярджаюць, што фігуранты гучных справаў зазнаюць вялікія праблемы і нястачы ў ПК-1. У калоніі ўтрымліваецца шмат журналістаў, сярод якіх галоўны рэдактар «Белапан» Андрэй Аляксандраў і актывіст «Саюза палякаў» Андрэй Пачобут, «рэйкавыя партызаны», прафсаюзныя лідары, памочнік Сяргея Ціханоўскага Юрый Уласаў, былыя міліцыянты і некаторыя дзяржаўныя службоўцы раённага і абласнога маштабаў, кіраўнік «Белгазпрамбанка»Віктар Бабарыка. Блогер Эдуард Пальчыс і анархіст Аляксей Ляўковіч пасля шматлікіх знаходжанняў у ШІЗА і ПКТ з Наваполацкай калоніі былі пераведзеныя ў турму.

> «З іх там здзекуюцца канкрэтна. Калі такімі дробнымі палітычнымі, як за каментар, як у мяне, можна згубіцца крыху, пакуль пра цябе не ўзгадаюць, то такім фігурам, як Лосік, Бабарыка, складана».

[19] Гл. раздзел гэтага дакумента пра ўмовы ўтрымання ў ШІЗА і ПКТ.

# Віктар Бабарыка: поўная ізаляцыя і «вугальнае пекла»

«Калі ён крыкнуў “Вы наш прэзідэнт!” (Бабарыка тады толькі прыехаў у лагер), ён адседзеў у ШІЗА дзён 90. Потым яму яшчэ павесілі 10-ты прафулік. І потым ён паехаў у крытую ў Магілёў». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)



Фота 4. Віктар Бабарыка. Крыніца: https://euroradio.fm/shmat-smercyau-i-katavanni-shto-dzeecca-u-kalonii-dze-trymayuc-viktara-babaryku

Калі ў калонію паступае палітычны зняволены, пра гэта загадзя ведае ўсё яе кіраўніцтва. Але з прыездам Віктара Бабарыкі[20] ў ПК-1 пачалася сапраўдная паніка. Паводле словаў былога палітзняволенага, у калоніі ніхто не ведаў, куды яго «ўтыкнуць» — у які атрад, на якую працу, як арганізаваць умовы яго знаходжання, каб мінімізаваць любыя кантакты з

[20] Банкір, грамадскі і палітычны дзеяч, мецэнат. У 2020 годзе вылучаў сваю кандыдатуру на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Асуджаны да 14 гадоў пазбаўлення волі.

іншымі зняволенымі. Ужо ў каранціне ў зняволеных пачаліся праблемы з-за камунікацыі з Віктарам Бабарыкам.

> «Калі мы ўсе прыехалі ў каранцін, нам казалі, што з Бабарыкам камунікаваць — гэта будзе праблема адразу. “Нават калі вы будзеце стаяць разам па атрыманне гэтых заказных лістоў, не вітайцеся, не размаўляйце”. У нядзелю я прынцыпова дамовіўся з ім, што ён нам раскажа пра тое, як збіралі карцінную галерэю. Мы проста сядзелі, я піў каву, Бабарыка расказваў. Мы яшчэ ўзялі кніжку ў бібліятэцы пра беларускае мастацтва і, уласна, вялі свецкую гутарку. І на наступны дзень усё паехала... Я “папіў каву добранька” — і “з’ехаў” [у ШІЗА] на 20 дзён. Ведаю, людзі, якія з ім проста не баяліся лішні раз пагаварыць, таксама “з'язджалі”».

Спецыяльна пад Бабарыку пякарню, якая знаходзілася ў другім атрадзе, перанеслі ў шосты — самую маленькую і схаваную лакальную зону. Сеткавы плот замянілі на глухую браму, каб ніхто не мог яго ўбачыць. Віктар Бабарыка спачатку працаваў апальнікам, потым — укладчыкам хлебабулачных вырабаў. Тэмпература ў памяшканні — вышэй за 30 градусаў, вентыляцыі няма, вакол пыл, дзве распаленыя печы. Ён пёк хлеб, ляпіў булачкі, круціў макароны. З ім працавалі яшчэ некалькі чалавек, але размаўляць з ім забаранялі. За размову з Віктарам Бабарыкам людзей адпраўлялі ў ШІЗА.

> «Калі прыехаў Бабарыка, напрыклад, двух чалавек адправілі не ў каранцін, а адразу ж у ШІЗА. Яны дапамаглі Бабарыку торбы несці. Фармальна ў іх знайсці прычыну не праблема: расшпілены гузік, не павітаўся...»

Да прыезду палітыка колькасць камераў відэаназірання ў пякарні павялічылі з пяці да дванаццаці — каб не засталося ніводнага сляпога кута. Кожны ягоны крок, кожны рух фіксаваліся. За ім сачылі не толькі відэакамеры, але і так званыя «стукачы» — падкантрольныя адміністрацыі зняволеныя, якія пісалі даносы і дакладвалі пра кожнае яго дзеянне.

«Бабарыка да таго часу, пакуль яго не пачалі прэсаваць, жыў асобным светам. Яму заўсёды давалі працу на ізаляваных участках — хлеб пекчы ці вугаль [паліць]. То бок, там, дзе ён ізаляваны ад астатніх людзей. З ім працавалі адзін-два чалавекі, і яны праверaныя, патрэбныя людзі. Потым, калі яго пачалі запрэсоўваць, з ім працаваў такі хлапчына: ён яго і ў бочку прымушаў лазіць, хаця ў яго даведка была, што яму туды нельга. Карацей, мікранаглядальнік. І я добра памятаю, што потым, калі Бабарыку забралі ўжо на ПКТ, ён яго куртку насіў са словамі: “Я яе зарабіў”. Там, дзе працаваў Бабарыка, дадавалі лішніх камераў назірання, і такі равун [пачынаўся], калі дзверы адчыняюцца… Усе ведалі, калі Бабарыка ў прыбіральню ідзе, бо, каб яго вывесці з таго ўчастка, трэба ж адчыніць».

У лістападзе 2022 года Бабарыку перавялі на іншае месца працы — у брыгаду па вытворчасці драўнянага вугалю, нягледзячы на тое, што ён мае медыцынскія супрацьпаказанні да такой працы. Гэта лічыцца адной з самых цяжкіх і брудных працаў у калоніі. Зняволеныя цэлымі днямі працуюць на вуліцы, без доступу ў бытоўку, з топкамі, угарным газам, цяжарам і гарам, які ўядаецца ў скуру. Тут за Бабарыкам не спынялася пастаяннае назіранне, і ўсе яго перамяшчэнні кантраляваліся.

«Каля яго два-тры стукачы было заўсёды. Два па баках і адзін ззаду. Яны ідуць і па баках глядзяць. Ён, як пад канвоем з зэкаў, па лагеры перасоўваецца. Куды б ён ні ішоў, тры чалавекі за ім».

«Ты стаіш, колеш дровы ці нечым займаешся, бачыш — міліцыя з гэтымі “казламі” ўжо пабеглі за Бабарыкам. Бягуць да яго на працу даваць парушэнні. У яго ж тэрыторыя, дзе ён працаваў, гэтыя вуглі, — яна была пад сігналізацыяй. І калі ён выходзіць адтуль, калі сігналізацыю не адключылі і нехта не прыйшоў яму дзверы адчыніць, — усё, яно адразу “віў-віў-віў”. Сірэна спрацоўвае, ужо бягуць парушэнні даваць».

Палітзняволены, які быў з Бабарыкам у 4-м атрадзе і працаваў на вуглях, распавядае:

«Ён вельмі худы, сутулы, моцна схуднеў. Яму забароненыя ўсе перадачкі. Потым яго ўвогуле на ПКТ закрылі. Нядаўна мой знаёмы добры вызваляўся. Ён расказаў, што на ПКТ бачыў Бабарыку. Калі жывы, то ўжо добра... А так мы не бачылі яго з канца вясны 2023 года. Потым яго неяк выпусцілі на некалькі дзён, а потым зноў закрылі».

«Не дай бог з Бабарыкам у адным атрадзе знаходзіцца — шмон праз дзень. Прычым шманаюць канкрэтна. Я так думаю, што гэта адзін з метадаў ціску на яго, каб праз зняволеных, каб выклікаць агрэсію, злосць на яго. Але калі я правільна зразумеў сітуацыю, то там усе адэкватныя былі людзі, разумелі, што і як, і што ён не можа на гэта паўплываць».

З лютага 2023 года ўмовы ўтрымання Бабарыкі рэзка сталі больш жорсткімі. Яго паставілі на 10-ты прафулік як «схільнага да захопу закладнікаў» — нагодай сталі драпіны на прываконні ад нажа, калі ён рэзаў сала. Доступ адваката абмежавалі, атаварку ў турэмнай краме забаранілі, пазбавілі перадачаў ад сваякоў, кожнае парушэнне суправаджалася ШІЗА. Размовы з ім зноў сталі падставай для новых рэпрэсій.

«Калі ён адмаўляўся мыць прыбіральні, яго спачатку пасадзілі ў ПКТ, а потым — зноў у ШІЗА. Усё, што маглі, адабралі. Нават кнігі пачалі абмяжоўваць. Забаранілі літаратуру беларускіх аўтараў, замежныя мовы, лісты не даходзяць».

«У адзін момант да яго стаўленне рэзка памянялася. Яго вадзілі кудысьці на нейкія размовы. Мы нічога не ведалі, не разумелі, мы проста бачылі, што яго некуды павялі. І вось пасля аднаго такога прыезду раптам усё памянялася. У сваякоў не прынялі перадачу, спаткання пазбавілі. І пайшлі ШІЗА, ШІЗА, ШІЗА...»

У красавіку 2023 года Віктар Бабарыка быў дастаўлены ў хірургічнае аддзяленне бальніцы ў цяжкім стане.[21]

> «У санчастцы, калі ён туды патрапіў, у адным з пакояў усталявалі камеру відэаназірання. Відавочна, яна прызначалася для Бабарыкі. Многія зняволеныя бачылі яго праз вакно з перавязанай галавой. Тым часам у міліцыі пачалі распаўсюджваць чуткі пра тое, што Бабарыка ўпаў. Адзін мой знаёмы зняволены зайшоў у санчастку якраз у той час, калі Бабарыка быў там, калі яго везлі з турэмнай лякарні ў Калядзічах. Ён спытаў: "Што з вамі, Дзмітрыевіч?" Той адказаў: "Я ўпаў". Відаць, так яму і загадалі сказаць».

Былы зняволены дадае, што ў калоніі хадзіла інфармацыя пра тое, што ў Віктара Бабарыкі праколатае лёгкае, ёсць праблемы з ныркамі, і ён некалькі разоў страчваў прытомнасць. Пазней ён быў пераведзены ў СІЗА-1 у Мінску, а потым зноў вернуты ў калонію. Усё лета ён правёў у ПКТ.

З лістапада 2023 года Віктар Бабарыка знаходзіцца ў поўнай ізаляцыі. З гэтага часу ні сваякі, ні грамадскасць не маюць ніякіх пацверджанняў пра ягонае месцазнаходжанне.[22]

Паводле словаў відавочцаў у калоніі, у пачатку 2024 года яго звезлі невядомыя людзі ў масках, забараніўшы іншым зняволеным нават выглядваць. Меркавалася, што яго рыхтавалі да магчымага ўдзелу ў судзе сына Эдуарда, але ў выніку не прывезлі ні на адзін працэс. Перыядычна вызваленыя з ПК-1 зняволеныя паведамляюць пра Віктара Бабарыку вядомую ім інфармацыю.

Так, адзін з задакументаваных «Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі»былых палітзняволеных, паведаміў наступную інфармацыю:

> «...я пазнаёміўся з адным зняволеным. Гадоў 50, сядзеў за жорсткае забойства, і ў яго відавочна былі ментальныя праблемы. Ад яго я даведаўся, што цягам паўгода ён знаходзіўся ў адной камеры

[21] https://news.zerkalo.io/economics/37775.html
[22] https://news.zerkalo.io/economics/37786.html

> з Віктарам Бабарыкам. Распавядаў, што той, нягледзячы ні на што, заўсёды сачыў за сабой, рабіў зарадку, быў максімальна інтэлігентны, але з ім — качком — чамусьці не камунікаваў. І я магу здагадацца, чаму. Віктар Бабарыка — разумны чалавек, і, мяркуючы па ўсім, адразу зразумеў, што побач з ім чалавек з нестабільнай псіхікай, таму прыняў для сябе тактыку не камунікаваць, каб не правакаваць канфлікт з наступствамі. Зыходзячы з таго, што Віктара намагаюцца нікому не паказваць, магу зрабіць выснову, што гэтага зняволенага да яго падсадзілі спецыяльна, каб той яго маральна зламаў, збіў ці зліваў пра яго інфармацыю ўзамен на паслабленне рэжыму для сябе ж. Даволі папулярны прыём у ПК-1».

Зняволеныя расказваюць, што Віктар Бабарыка стараўся ні з кім са зняволеных не размаўляць, каб не наклікаць на іх непрыемнасці.

> «Таму што калі ты з ім камунікуеш, то ты будзеш ездзіць па ШІЗА. Калі ты да яго хочаш падысці і пагаварыць, ён звычайна: “Так! Не варта!” Ён з разуменнем да гэтага ставіўся, таму што ты з ім пагаворыш і паедзеш у ШІЗА забіваць сваё здароўе».

Зняволеныя паведамілі таксама пра факт жорсткага збіцця маладога зняволенага за камунікацыю з Віктарам Бабарыкам.

> «Яго збілі на ШІЗА так, што ў яго там на некалькі тыдняў ногі адняла. Калі цябе ў ШІЗА моцна збілі, то цябе будуць пакідаць у ШІЗА, пакуль усё не зажыве, каб выпусціць назад у жылую зону. Потым Бабарыка, у прынцыпе, мала з кім стасаваўся, таму што ведаў, што адбываецца за камунікацыю з ім».

8 студзеня 2025 года Раман Пратасевіч[23] апублікаваў фота і відэа сустрэчы ў ПК-1 з палітзняволеным Віктарам Бабарыкам, пра якога не было ніякіх вестак больш за паўтара года.[24]

Паводле словаў Пратасевіча, ён прывёз для Бабарыкі лісты ад блізкіх сваякоў і запісаў відэазварот апазіцыянера да родных. Віктар Бабарыка падчас сустрэчы таксама напісаў некалькі лістоў для родных і перадаў іх блогеру. «Адразу скажу: асноўная мэта майго візіту была перадаць вестачкі ад яго радні яму і, адпаведна, даставіць ужо ягоны ліст у зваротным напрамку», — распавёў Пратасевіч. Сапраўдныя прычыны гэтага візіту невядомыя.



Фота 5. Былы кіраўнік «Белгазпрамбанка», прэтэндэнт на пасаду кандыдата ў прэзідэнты Віктар Бабарыка і Раман Пратасевіч у ПК-1. Крыніца: https://info214.by/event/226

Ніякай афіцыйнай інфармацыі пра стан Віктара Бабарыкі з таго часу не паступала. Палітык працягваў знаходзіцца ў Наваполацкай калоніі ў жорсткіх умовах ПКТ без сувязі са знешнім светам.

16 жніўня 2025 года ў СМІ распаўсюдзілася інфармацыя, што Віктар Бабарыка знаходзіцца ў сваім атрадзе і зноў працуе ў пякарні.[25]

[23] Блогер Раман Пратасевіч супрацоўнічаў з беларускай службай «Радыё Свабода», «Еўрарадыё», быў шэф-рэдактарам Telegram-канала «Nexta». Пасля затрымання ў 2021 годзе супрацоўнічаў са следствам і публічна каяўся ў зробленым. Фактычна знаходзіцца ў стане закладніка сістэмы і выкарыстоўваецца рэжымам для сваіх мэтаў.
[24] https://news.zerkalo.io/economics/87902.html
[25] https://pozirk.online/be/news/151449

# Андрэй Пачобут. «Яго ўсяляк там ламалі, але ён трывалы і непахісны»

«Пачобута прывезлі, адразу закінулі ў ШІЗА. Потым з ШІЗА на ПКТ, то бок, ён там усяго два дні пабыў. Калі мы на прамзону ішлі, бачыў, як яго з ПКТ пад рукі вялі ў санчастку, нешта там здарылася». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)




Фота 6. Банер з палітзняволеным журналістам і актывістам «Саюза палякаў Беларусі» Андрэем Пачобутам. Беласток, Польшча. 20 студзеня 2023 года. Фота: Beata Zawrzel / Reporter / EAst News. Крыніца: https://ru.belsat.eu/83911548/losik-ishudal-pochobut-derzhit-marku-aleksandrov-vyezzhaet-na-pozitive-chto-s-politzaklyuchennymi-zhurnalistami-iz-ik-1

Паводле словаў аднаго з былых палітзняволеных, у калоніі Пачобута[1] неаднаразова спрабавалі зламаць.

> «Пры мне ён увесь час быў на ШІЗА. Яго адзін раз выпусцілі. Але ў той момант яго ўвогуле не падпускалі да іншых людзей».

На Андрэя пачаўся ціск праз рэжымныя хітрыкі. У яго раскладзе прыбірання раптоўна з'явілася заданне, якое ён фізічна не мог выканаць. Гэта стала падставай для змяшчэння ў ПКТ.

> «Пачобут сядзеў увесь час у ШІЗА, у ПКТ. Потым ведаю, што пасля мяне яго ўжо выпускалі, ён у атрадзе жыў. Але пры мне гэта былі толькі ШІЗА і ПКТ».

Знаходжанне ў калоніі сур'ёзна ўдарыла па здароўі журналіста. У Пачобута праблемы з сэрцам, «скача»ціск, пагоршыўся зрок. Пры гэтым яму неаднойчы адмаўлялі ў перадачы лекаў. Лісты і пасылкі затрымліваюцца месяцамі, спатканняў і званкоў з роднымі практычна не даюць.

> «Яго ў чарговы раз закрывалі ў ШІЗА, ён паскардзіўся на высокі ціск. Яго адвялі да лекара, лекар памераў, сапраўды высокі. Быў малады лекар з добрай рэпутацыяй, і ён не даў дазвол заключаць яго ў ШІЗА. На наступны дзень яго павялі ўжо да начальніцы медчасткі, і яна яго закрыла. Ведаю, што гэты лекар малады праз некаторы час звольніўся».

Паводле словаў відавочцаў, да Пачобута неаднаразова прыязджалі і ўгаворвалі напісаць прашэнне пра памілаванне. Для гэтага яму нават падсоўвалі гатовыя бланкі, дзе трэба было толькі паставіць подпіс.

---

[26] Журналіст з Гродна і актывіст «Саюза палякаў Беларусі» Андрэй Пачобут быў затрыманы 25 сакавіка 2021 года. 8 лютага 2023 года суд прызнаў яго вінаватым у «закліках да дзеянняў, скіраваных на нанясенне шкоды нацыянальнай бяспецы» і «распальванні варожасці» і асудзіў да васьмі гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Міністэрства ўнутраных спраў занесла яго ў рэестр так званых «экстрэмістаў», а Камітэт дзяржбяспекі — у пералік «асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці».

Для гэтага яму нават падсоўвалі гатовыя бланкі, дзе трэба было толькі паставіць подпіс. Але журналіст заставаўся непахісным і адмаўляўся ад подпісу.[27]

> «Па тым, як яго ламаюць, мы зразумелі: гэта прынцыповая гульня Лукашэнкі. Яму важна, каб Пачобут пакаяўся асабіста. Але ён не зламаўся».

Лукашэнка ў свой час адкрыта ў гэтым прызнаўся: ён заявіў, што гатовы абмяняць журналіста на чальцоў апазіцыйнага Нацыянальнага антыкрызіснага ўпраўлення (НАУ) на чале з Паўлам Латушкам. Фактычна Андрэй Пачобут знаходзіцца ў палоне ў рэжыма, а ягоны лёс залежыць ад рашэння аднаго чалавека.

---

[27] Асуджэнне і далейшае зняволенне ў калонію Андрэя Пачобута выклікалі вялікі міжнародны рэзананс. Польшча ў адказ на прысуд закрыла памежны пераход «Баброўнікі» на беларуска-польскай мяжы, а афіцыйны Мінск увёў люстэркавыя абмежаванні для польскіх перавознікаў, забараніўшы ім перасякаць мяжу праз Літву і Латвію.

# Ігар Лосік: голас свабоды, які хочуць знішчыць




Фота 7. Ігар Лосік. Фота svaboda.org. Крыніца: https://news.zerkalo.io/life/34976.html

Паводле расповедаў былых палітзняволеных, упершыню Ігара Лосіка[28] ў калоніі №1 убачылі на прамзоне. Ён разбіраў старыя кабелі, ачышчаючы іх ад ізаляцыі, — праца цяжкая, шкодная і вельмі зневажальная для зняволеных з «высокім статусам».

> «Ён быў бледны, моцна схуднелы, але вельмі засяроджаны. Відаць было, што трымаецца з апошніх сілаў».

Асаблівы ціск на Лосіка тлумачыўся яго медыйнасцю і прынцыповасцю. Ён адмаўляўся ад любых прапановаў пра супрацу, адмовіўся пісаць прашэнне пра памілаванне. Жонка працягвала казаць пра яго ў інтэрв'ю — і кожны раз пасля чарговай згадкі ў медыя на Ігара ўзмацняўся ціск.

[28] Блогер, медыя-аналітык, кансультант «Радыё Свабода» і аўтар тэлеграм-канала «Беларусь галаўнога мозгу» Ігар Лосік быў асуджаны да 15 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму і прабыў за кратамі больш за пяць гадоў..

Пазней яго размеркавалі ў атрад, у якім зняволеныя перабіраюць поліэтылен для перапрацоўкі, і некаторы час ён знаходзіўся ў калоніі адносна спакойна. Пасля таго як пасадзілі на два гады жонку Ігара Лосіка, яго маральны стан рэзка пагоршыўся. Акрамя таго, адміністрацыя калоніі пачала надаваць яму ўзмоцненую ўвагу.

> «У яго праблемы пачаліся, калі жонку закрылі. Ён вельмі маральна прасеў. Ведаю, што яго некалькі разоў таксама вазілі на кабінеты. Па ягоным твары можна было сказаць, што, хутчэй за ўсё, ішоў нейкі гандаль, і ён гэта разумеў. Ён спадзяваўся, што яго абмяняюць. Улічваючы, што потым Кузнечыка абмянялі, то я не здзіўлюся, што гэта ўсё даўно абмяркоўвалася тым ці іншым чынам. Потым, калі яго пачалі закрываць на ШІЗА, стала зразумела, што ў хлопца праблемы і хутка будзе ПКТ».

У адзін з дзён да яго ў камеру прыйшлі супрацоўнікі адміністрацыі з відэакамерай і запатрабавалі мыць прыбіральню. Такі загад у калоніі прыроўніваецца да спробы апусціць зняволенага ў НСС. Ігар адмовіўся. За гэта яго неадкладна адправілі ў ШІЗА.

> «Яго прапусцілі праз працэдуру гэтага прыбірання ўнітазаў. Ён сябе вельмі моцна парэзаў. Але хлопцы, якія паспелі гэта ўбачыць, сказалі, што дэманстратыўна. То бок, мэта была — менавіта шмат крыві, а не пагроза жыццю. Яго перабінтавалі. Некалькі дзён быў на бальнічцы».

Пазней пайшло яшчэ больш суровае пакаранне — перавод у ПКТ. Гэта форма ізаляцыі, прыраўняная да карцара, але на працяглы тэрмін. Лосік знаходзіўся там амаль пастаянна. Адзін раз яго выпусцілі — усяго на адзін-два дні. Тыя, хто яго тады бачыў, былі ўражаныя.

> «Гэта быў не чалавек, а цень. Скура ды косткі. Абсалютна белы. Здавалася, што ён памірае».

Зняволеныя пачалі дапамагаць: хтосьці таемна дзяліўся ежай, хтосьці спрабаваў падтрымаць словам. Але адміністрацыя адрэагавала жорстка: усіх, хто надаў Лосіку дапамогу, адправілі ў ШІЗА, некаторых — адразу на некалькі тэрмінаў запар. Самога Ігара зноў вярнулі ў ПКТ. Яго стан крытычна пагоршыўся, з'явіліся звесткі пра спробу самагубства. Ён парэзаў сабе рукі і шыю.[29]

Вясной 2025 года Ігар Лосік знік з ПК-1. Паводле словаў відавочцаў, у той дзень быў цалкам спынены рух па тэрыторыі калоніі, каб звесці да мінімуму колькасць сведкаў.

[29] https://news.zerkalo.io/life/34976.html

# Правакацыі і «стукацтва»

> «Больш за ўсё нацкоўвалі міліцыю на палітычных зняволеных. Ім падабалася, калі пра палітычных нешта даносілі». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

«Стукацтва» з боку зняволеных вельмі распаўсюджанае ў ПК-1. Яно пачынаецца ўжо на этапе знаходжання тых, хто нанова прыбыў, у каранціне.

> «Ёсць даносчыкі, якія “стукаюць”, даносяць час ад часу, іх выклікаюць да аператыўніка, яны ў актыве не знаходзяцца… [ім] здымуць пакаранне пазачарговае, яны добра прасоўваюцца па сістэме ўмоўна-датэрміновага вызвалення, замены».

Даносы, асабліва на палітычных зняволеных, заахвочваюцца адміністрацыяй. «Актыў» атрада паведамляе адміністрацыі пра ўсё, што адбываецца з палітычнымі зняволенымі.

> «Палітычныя вырашылі з Віктарам Дзмітрыевічам папіць гарбату і недзе некалькі гадзінаў сядзелі, размаўлялі. Іх здаў потым загадчык гаспадаркі шостага атрада. Іх адправілі ў ШІЗА. Яны [стукачы] стараюцца выслужыцца, каб пайсці потым на замену рэжыму ці ўмоўна-датэрміновае вызваленне».
>
> «Мяне выклікалі чатыры разы, і опер казаў: “Бачыш, як ты часта да мяне ходзіш? Ты зразумей, што той, хто часта ходзіць да операў, — той “стукае”, значыць цябе западозраць. Можа, давай насамрэч…”»

# Фізічны і псіхалагічны гвалт над зняволенымі

«Я проста адчуваў абсалютную бездапаможнасць, я не ведаў, што рабіць, я быў упэўнены, што я з гэтым не спраўлюся, я ўпаў духам...» (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Зняволеныя ў ПК-1 сістэматычна знаходзяцца пад фізічным і псіхалагічным гвалтам з боку супрацоўнікаў калоніі. Экспертамі ў дадзеным расследаванні былі больш падрабязна вывучаныя выпадкі ўжывання гвалту менавіта да палітычных зняволеных.

«Калі я быў на ПКТ, крыкі ад збіцця чуваць было нават на калідоры. Яшчэ яны практыкуюць збіццё ў душавой. Яны прадугледжваюць збіццё да крыві, таму што ў душы гэта ўсё змываецца потым шлангам. Робяць гэта непасрэдна кантралёры, склад гэтага вайсковага нарада, то бок унутраныя войскі».

«Я чуў... Гэта ні з чым не параўнаецца. Тупыя ўдары па целе, яны добра чуваць, як і галашэнні чалавека. Ты проста чуеш гэтае “м-м, м-м, м-м”. Такі глухі ўдар... Відавочна, што адбываецца».

«Яго гнабілі, ён адсядзеў больш за 100 сутак зімой у камеры, якая ў канцы калідора. Да такога стану давялі чалавека, што ў яго патрэскаліся вусны ад холаду, ад скразняку, рукі патрэскаліся да крывацёку. Ён там спрабаваў грэцца каля батарэі і атрымаў сабе апёкі спіны. Пальчык да яго прыйшоў і паглядзеў:
— Чаго ў цябе з вуснаў кроў цячэ? Ты сам сябе б'еш?
— Не, гэта ў мяне авітаміноз, у мяне вусны патрэскаліся.
— А, у цябе авітаміноз, ну, у цябе алюмініевая міска ёсць, можа табе алюмінія не хапае, ліжы алюмініевую міску».

«Было бачна, што да яго было прадузятае стаўленне з боку начальніка калоніі. Ён яго абражаў пастаянна, правакаваў, біў яго па нагах, на “расцяжку”...»

Сведкі паказваюць на канкрэтных супрацоўнікаў ПК-1, якія сістэматычна ўжывалі фізічны гвалт да асуджаных. У першую чаргу адзначым былога начальніка ПК-1 Андрэя Пальчыка, які не толькі ведаў пра неправамернае ўжыванне гвалту супрацоўнікамі, але і асабіста збіваў зняволеных.

«Збіваюць там тры чалавекі. Яны ўсе буйнога целаскладу, моцныя фізічна. Пальчык, начальнік калоніі, Філіп Уладзіміравіч, які капітан, ДПНК. Ёсць яшчэ такі зам, дакладней, начальнік рэжымнай часткі. Маёр. Яны пад 1,90 м ростам. Такія ў іх схільнасці ёсць — збіваць людзей. Менавіта яны ініцыятары такіх экзекуцый».

«Яны інсцэнавалі, нібыта ён нападае на іх. Пасля гэтага пачалі яго збіваць. Атрымалася так, што ён цісне яму руку, потым кантралёр робіць выгляд, што яму нібыта закручваюць руку, на залом бяруць. І гэта ўсё на камеру здымаецца... Яны яго жорстка збівалі пасля гэтага. Завялі супраць яго крымінальную справу, нібыта за напад, і паставілі яму ўмову: ці ён забываецца на тое, што з ім было, і нікому не кажа, нікому не піша, не скардзіцца, ці будзе крымінальная справа. Яму 411-ты артыкул ставяць і дададуць тэрмін. Так яго шантажавалі».

«Такі ён [Лісоўскі], пастаянна спрабаваў мяне справакаваць, падначыць, падчапіць. Ён таксама можа ўдарыць».

«Пры Пальчыку, ведаю, збівалі ўнутры. Ведаю, што аднаго дзеда, у якога звязкі ў выніку аварыі парваныя на адной назе, ён паспрабаваў паставіць на расцяжку — дзед проста ўпаў, таму што ў яго нага не трымае. Ведаю, што Пальчык асабіста збіваў».

«[Пра “расцяжку”] Ставяць да сцяны, рукамі на сцяну, пару крокаў ад сцяны, і разбіваюць ногі шырэй і шырэй да такой ступені, як быццам сядаеш на шпагат. Пакуль дазваляе расцяжка і пакуль ты не ўпадзеш ад болю ці страты раўнавагі, або можаш траўму атрымаць. Яны расцягваюць і або прымушаюць доўга так стаяць, або могуць у гэты момант яшчэ больш расцягваць, біць па рэбрах».

«Да гэтага чалавеку, калі вазілі ў лякарню, — яго збілі, — выразалі селязёнку. Ён потым сядзеў ужо на “крытай” у Магілёве. Яго білі два месяцы. То бок, кожны дзень на працягу двух месяцаў яго збівалі».

«Яго збівалі разы тры, вельмі жорстка. Заводзілі ў душавую, білі па начах. Я чуў гэтыя крыкі. Неяк уначы я прачнуўся з-за таго, што крыкі там вар'яцкія стаялі. Іх чалавек пяць ці шэсць было. Дубінамі адбілі так, што ён крычаў як рэзаны».

«Мне прыціскаюць рукі да сцяны, з двух бакоў стаяць супрацоўнікі і пачынаюць біць па нагах, расцягваючы. І пачынаюць крычаць на мяне: “Ты што, не зразумеў, куды патрапіў?! Чуеш, ты там!” Я падаю на зямлю. Б'юць па ўнутраных, па ступнях. Адзін б'е ў свой бок, іншы ў свой. Па ступнях, каб яны раз'ехаліся на падлозе. Цябе трымаюць за рукі і садзяць на ўздоўжны шпагат».

# «Парушэнні» і пакаранні

«Там жа парушэнні атрымліваеш дастаткова проста. Не павітаўся, гузік не зашпілены, або яшчэ штосьці. Нават калі павітаўся, гэта не важна. Калі яны прыйшлі даваць парушэнне, яны табе яго ўжо далі». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

У адпаведнасці з Крымінальна-выканаўчым кодэксам за парушэнне парадку адбыцця пакарання да асуджаных могуць ужывацца меры спагнання, уключаючы вымову, пазачарговае дзяжурства па прыбіранні, пазбаўленне права на пасылкі ці спатканні, змяшчэнне ў ШІЗА да 15 сутак[30] і перавод злосных парушальнікаў у ПКТ на тэрмін да шасці месяцаў.

Акрамя таго, да асуджаных, якія злосна парушаюць усталяваны парадак адбыцця пакарання, можа выкарыстоўвацца перавод у турму на тэрмін не звыш за тры гады.[31]

«Самае страшнае пакаранне — гэта калі твае сваякі да цябе едуць на спатканне, ужо выехалі аднекуль, з Брэста, напрыклад. А цябе ў ШІЗА кінулі адмыслова».

«Прыходзіць яму пасылка, а яго хочуць рэзка пакараць. Пасылка ляжыць на пошце. Яны з пошты тэлефануюць у лагер, кажуць, што гэтаму чалавеку пасылка. Гэтага чалавека за пяць хвілінаў караюць, пазбаўляюць пасылкі. Адразу на пошце не забіраюць, адпраўляюць назад дадому».

У дачыненні да палітычных зняволеных адвольна ўжываюцца спагнанні з мэтай стварэння бесчалавечных умоваў адбыцця пакарання і магчымасці пераводу іх у ПКТ ці на «турэмны рэжым», а пасля і прыцягнення да крымінальнай адказнасці па арт. 411 КК.

[30] Да ліпеня 2024 года максімальны тэрмін змяшчэння ў ШІЗА быў 10 сутак.
[31] Гл. ч. 5 арт. 69 КВК.

«Звычайна зняволенаму паведамляецца, што ён парушыў тое і тое, на яго будзе складзены рапарт. Пасля чаго праходзіць некалькі дзён, яго выклікаюць і кажуць пісаць тлумачальную. У чалавека выбар: або пісаць, або не пісаць. І ў большасці выпадкаў усё заканчваецца ШІЗА».

«Прычым па законе пакаранне — да 10 сутак. А гэта могуць быць адны суткі, можа быць 5 сутак, можа быць 6, 7, 10. Але ў ПК-1 наогул няма такога, то бок ШІЗА — гэта заўсёды 10 сутак, за любое парушэнне. Усе выдатна ведаюць, што іншага тэрміна не бывае».

# ШІЗА і ПКТ

«Што можна стоадсоткава аднесці да катаванняў,— гэта ўтрыманне ў ШІЗА». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Змяшчэнне ў ШІЗА і перавод у ПКТ з'яўляюцца самымі цяжкімі спагнаннямі, прадугледжанымі ў КВК. Мяркуецца, што яны ўжываюцца ў выключных выпадках, калі іншыя віды спагнанняў не могуць уздзейнічаць на зняволенага. У ПК-1 змяшчэнне ў ШІЗА выкарыстоўваецца пры наяўнасці найменшых фармальных парушэнняў ці без іх проста таму, што асуджаны з'яўляецца «палітычным».

«У ШІЗА маглі закрыць каго заўгодна: быў бы чалавек — артыкул знойдзецца. Рабілася ўсё гэта вельмі проста: праводзіўся шмон канкрэтнага чалавека, яго рэчаў. Вельмі складана палічыць цыгарэты тым, хто паліць, а ў іх цыгарэты таксама былі як сродак разліку. Адной цыгарэты няма — усё, ідзеш на ШІЗА».

Часта практыкуюць накладанне спагнанняў на асобу, якая ўжо знаходзіцца ў ШІЗА ці толькі з яе выйшла.

«У ШІЗА на наступны дзень на мяне напісалі акт пра тое, што ў камеры не прыбрана. Літаральна зранку ўжо прыйшлі і сказалі, што “яшчэ адзін акт на цябе”, што “ўжо не 10, а 20 сутак табе”. І потым недзе дні праз 2–3 да мяне прыйшлі. А ў мяне пасля сняданку засталася скарыначка хлеба. Але яны: “О, забароненыя прадукты харчавання”. “Як “забароненыя”? Гэта мне сёння зранку выдалі. Ён не можа быць забаронены ў прынцыпе”. Мне далі месяц адразу ж».

«Я ведаю людзей, якія 70 і 80 сутак прасядзелі. Яны фармальна цябе выпускаюць з ШІЗА, даводзяць да атрада і складаюць рапарт за нібыта расшпілены

гузік. І вядуць назад, і зноў тэрмін ад нуля да 40 сутак. Я сустракаў людзей, якія 100 і больш сутак адсядзелі такім чынам».

Заканадаўствам (КВК і Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установаў) вызначаюцца ўмовы ўтрымання ў ШІЗА, якія на практыцы ў ПК-1 не выконваюцца.[1] Зняволеныя там утрымліваюцца ў бесчалавечных умовах.

«Прадметы абмежаваныя наступным спісам: рулон туалетнай паперы, зубная паста, зубная шчотка, мыла ў палоўцы мыльніцы».

«[Асвятленне] пераключаецца на начное, але даволі яркае. Увесь дзень там гарачь, што ў ШІЗА, што ў ПКТ, святлодыёдныя лямпы».

«Нары, якія адшпільваюцца кнопкамі на электразамках, на дзень прышпільваюцца, на ноч адшпільваюцца, удзень не пасядзіш, не паляжыш. Сядзець можна толькі за столікам, лавачка сантыметраў восем шырынёй».

Супрацоўнікі ПК-1 наўмысна ствараюць невыносныя ўмовы ўтрымання, асабліва ў дачыненні да тэмпературнага рэжыму; фактычна гэта катаванні холадам.

«Калі трапіў у міжсезонне, там адзенне ніякае, тоненькае, належнае. Батарэі выключаныя, вокны адчыненыя, у камеры скразняк гуляе. І схавацца няма куды, і пагрэцца ніяк».

«Зімой яшчэ батарэя ўключаная, людзі грэюцца каля яе, але яна жалезная. І я бачыў апёкі ў людзей, якія выходзілі з ШІЗА, хто грэўся каля батарэі і выпадкова там заснуў. То бок, у яго апёк на паўспіны, такое мяса запечанае».

[32] Падрабязней умовы ўтрымання ў ШІЗА апісаныя ў расследаванні пра ўмовы ўтрымання ў ПК-17 г. Шклова. (ст. 41–44): https://torturesbelarus2020.org/pytki_ik_17

«Ёсць адзіночныя камеры, вельмі халодныя ў ШІЗА. 13-ю “бадзёрай камерай” называюць. Яна нейкая вуглавая, і ўвесь вецер ідзе прама ў гэтую камеру. Туды закрывалі двух-трох людзей, яна маленькая такая, нідзе не паходзіш, нічым не пазаймаешся. Закрывалі для таго, каб проста памарозіць».

«Там я даведаўся, што, калі галаву абматаць ручніком, спаць значна цяплей, але гэта не моцна дапамагае. Паспаць хапае недзе максімум на дзве гадзіны. Пры -10, калі нас закрылі, на гадзіну хапала. Праз гадзіну ты проста прачынаешся ад холаду, нават з загорнутай у ручнік галавой, і пачынаеш хадзіць, адціскацца, прысядаць, да батарэі сядаць. А прысеў да батарэі — таксама можна 10 сутак зверху атрымаць».

«Ноч у ШІЗА — самае страшнае для любога чалавека. Таму што ўдзень спаць асабліва не хочацца. Але потым хочацца і ўдзень спаць таксама. Удзень хоць цёпла. А спаць уначы ты не можаш, таму што ляжыш і дрыжыш, цябе калоціць ад холаду».

«Новы начальнік [Машадаеў] забараніў знаходзіцца ў памяшканні ШІЗА і ПКТ у сваёй тэрмабялізне. Гэта вельмі сур'ёзны ўдар».

Апытаныя сведкі кажуць пра меншую колькасць ежы, якая даецца ў ШІЗА.

«Там уразаецца колькасць ежы. Не даюць належныя два яйкі, даюць адно яйка ў тыдзень».

«Любая крошка жаданая, не хапае ежы, таму што чалавек у стане стрэсу. Трэба пастаянна грэцца, займацца фізічнай нагрузкай, холад выцягвае калорыі з арганізма».

Нягледзячы на праведзены рамонт у памяшканнях ШІЗА, зняволеныя адзначаюць, што да паляпшэння ўмоваў утрымання гэта не прывяло. Супрацоўнікі калоніі наўмысна ствараюць там бесчалавечныя ўмовы ўтрымання і мэтанакіравана здзекуюцца са зняволеных.

««Месяц там знаходзіўся. Начальнік [Пальчык] да мяне хадзіў і казаў: “Я зраблю так, што ў цябе “паддашак” паедзе. Ты адсюль у мяне выйдзеш поўным дэбілам. Ты зайшоў сюды адзін, а выйдзеце ўтрох: ты, гемарой і ШІЗАфрэнія”».

«Там адбываецца збіццё. Гэта я таксама магу пацвердзіць, я гэта чуў, але не бачыў на свае вочы. Дзверы зачыненыя, але было чуваць. Пры мне, калі я сядзеў на ПКТ, збіваліся людзі. Не толькі палітычныя, збіваліся і звычайныя зняволеныя. За правіны, за непавагу да адміністрацыі».

«Што ў ШІЗА, што ў ПКТ кожны будны дзень лілі на падлогу прыкладна 5–10 літраў хлоркі, проста катавалі па сутнасці».

Утрыманне ў ШІЗА ў такіх умовах непазбежна цягнула негатыўныя наступствы для фізічнага і псіхічнага здароўя зняволеных.

«Адтуль людзі ўвогуле худыя выходзілі. Ныркі на холадзе працуюць хутчэй, вадкасць хутчэй адыходзіць з арганізма. Чалавек без вадкасці высыхае».

«Вельмі часта бегаеш у прыбіральню. Пачынае нешта ў арганізме адбывацца, і ты за ноч па пяць, па сем, па дзесяць разоў бегаеш у прыбіральню. Вадкасць выходзіць. Я за першае ШІЗА схуднеў на 24 кілаграмы».

### «Навагодні экспрэс».

Адміністрацыя ПК-1 напярэдадні Новага года наўмысна выкарыстоўвае адвольнае і масавае змяшчэнне зняволеных у ШІЗА. Пры гэтым не мае значэння, ці здзяйсняў зняволены якое-небудзь парушэнне.

«Ушчыльніць усіх ПКТ-шнікаў у адну-дзве камеры, астатняе цалкам забіць людзьмі, і тады будзе каля 90 чалавек. Звычайна там каля 30».

«Пры Пальчыку гэта было заўсёды. Мы думалі, можа ўсё зменіцца пры новым начальніку, але нічога не памянялася, усе месцы на Новы год занятыя цалкам».

### Пераклад асуджаных у ПКТ

з'яўляецца самым цяжкім спагнаннем і ўжываецца да палітычных зняволеных даволі часта. Фактычна гэта доўгачасовае ўтрыманне ў тых жа ўмовах, што і ў ШІЗА, з некаторымі паслабленнямі.

«ПКТ — гэта тое самае, што і ШІЗА, але ёсць разетка, якую ўключаюць тры разы па паўтары-дзве гадзіны. Ты можаш увечары не на голых нарах спаць, а атрымліваць матрац з пасцельнай бялізнай, і можаш два разы на тыдзень — якправіла, адзін — мець доступ да сваёй маёмасці. Нешта браць у адным экзэмпляры, ці то кніжка, ці сшытак, ці нейкія прадукты».

«Усё, што ты змог туды прынесці ў торбах, заканчваецца вельмі хутка, і ты застаешся без прадуктаў, таму што ніякія перадачы, ніякія пасылкі там не дазволеныя. Дазволеная адна бандэроль, раз на паўгода на два кілаграмы. Як правіла, людзям дасылаюць цыгарэты. Прагулка дазволеная да дзвюх гадзінаў, але яна доўжыцца 20-30 хвілінаў, за рэдкім выключэннем. Калі халодна ці дождж, то могуць на 40 хвілінаў вывесці, каб памерзнуць».

Часта адміністрацыя ПК-1 выкарыстоўвае перавод у ПКТ да палітычных зняволеных на паўгода, якія засталіся перад вызваленнем.

«У мяне заставалася паўгода да вызвалення, і ён [Пальчык] перанакіраваў мяне ў ПКТ. У мяне не было ніякіх парушэнняў. Ён мяне першапачаткова ў адзіночцы пратрымаў, у ПКТ гэтым мяне мучыў».

«Ёсць практыка такая — недзе за паўгода да вызвалення адпраўляць палітычнага ў ПКТ. Пачынаюць катаць па 10, 20, 30 [сутак у ШІЗА], а пасля гэтага рашэнне камісіі — чалавек адпраўляецца ў ПКТ».

# Медыцынскае абслугоўванне: «Пакуль можаш перасоўваць ногі — ніякай дапамогі не атрымаеш»

Былыя зняволеныя ПК-1 зазначаюць, што атрымаць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу ў калоніі практычна немагчыма. Зняволеных сустракае адзін медработнік — фельчар. Ніякіх лекараў-спецыялістаў, абследаванняў ці паўнавартаснага лячэння няма.

Вызваленне ад працы па **хваробе** не давалі, нават калі ў зняволенага падымалася высокая тэмпература, была моцная прастуда ці абвастрэнне хранічнай хваробы. У медчастцы такіх людзей называлі сімулянтамі.

> «Пасля працы на прамзоне застаецца адзін фельчар, і яму ўсё па барабане: даў усім ібупрафен ад усіх хваробаў — і вольны. Бальнічныя з тэмпературай можна нават не прасіць — не атрымаеш. Мне, напрыклад, ні разу не далі».

Адзін з апытаных, палітзняволены з хранічнымі хваробамі, перанёс у ПК-1 цяжкую пнеўманію, на якую захварэў ад пераахаладжэння ў ШІЗА. Медработнікі ігнаравалі скаргі на стан здароўя, які пагаршаецца, дазваляючы хваробе развіцца.

> «Часты боль у нырках, сутаргі. Лячэння ніякага — толькі абязбольвальнае, калі выпрасіш. Перахварэў на запаленне лёгкіх ад пераахаладжэння».

Паводле аповедаў зняволеных, фельчар можа тыднямі не накіроўваць хворага да лекара, абмяжоўваючыся абязбольвальнымі і гарачкапаніжальнымі сродкамі. Пакуль зняволены ў сілах стаяць на нагах, яго ганяюць на працу. Скаргі на боль, сутаргі і іншыя сімптомы ігнаруюцца. У выніку хворыя не атрымліваюць лячэння, і хваробы часта абвастраюцца да стану шпіталізацыі ў медустанову.

## Фізічныя траўмы

і калецтвы ў ПК-1 намагаюцца схаваць. Калі зняволены атрымаў перапом ці сур'ёзную траўму, нават пасля ўжывання катаванняў, шанцы на кваліфікаваную меддапамогу мінімальныя. Рану перабінтоўваюць, а зняволенага адпраўляюць у барак ці ў ШІЗА, каб ніхто не бачыў яго стан. Часам з-за хавання траўмаў і няправільна зрослых костак у людзей адбываецца заражэнне. Але нават тады іх не адпраўляюць у медустанову.

> «Ключыца ў яго зраслася няправільна — костка ўпіраецца ў горла, месцамі ўжо падгнівае, правая рука часткова непрацаздольная. Яго так прымушалі цягаць бярвенне».

У канцы красавіка 2023 года цяжкія траўмы атрымаў палітзняволены Віктар Бабарыка. Уначы яго таемна вывезлі з калоніі ў гарадскую бальніцу Наваполацка. Як высветлілася, у палітыка былі відавочныя сляды збіцця і дыягнаставаны спантанны пнеўматоракс (праколатае лёгкае). То бок, яго збілі да прабіцця лёгкага — фактычна да смяротнага стану — і толькі тады адправілі ў лякарню.

Тым не менш адміністрацыя заявіла, што здароўю Бабарыкі «нічога не пагражае». Праз некалькі дзён Віктара выпісалі з лякарні і змясцілі ў закрыты каранцінны блок (ПКТ) унутры калоніі, каб схаваць яго стан ад іншых зняволеных.

Вядомы выпадак, калі аднаму са зняволеных, які меў сур'ёзныя праблемы з пазваночнікам, быў неабходны бандаж для фіксацыі, каб пазбегнуць пагаршэння стану. Аднак належнай дапамогі ён у калоніі так і не атрымаў.

> «У першы мой паход да неўролага яна сказала, што мяне нічога не чакае, акрамя замены пазванка, вельмі цяжкай, траўмавальнай аперацыі. Але потым начмед падрабіў дакументы, каб проста пазбавіць мяне бандажа. Я напаўінвалід, а ён зрабіў так, каб у мяне яго не было».

Паводле словаў былога зняволенага, нават калі атрымлівалася дастаць неабходныя абязбольвальныя таблеткі праз родных, уколы ці прызначаныя лекарамі працэдуры даваліся не заўсёды. Адміністрацыя наўмысна выкарыстоўвала адмову ў медыцынскай дапамозе як

псіхалагічны ціск.

Такім чынам, лячэнне зняволеных залежала не ад медыцынскіх паказанняў, а ад волі начальніка калоніі і яго супрацоўнікаў.

## Акуляры

у ПК-1 пад фактычнай забаронай. Калі змянілася кіраўніцтва калоніі, адміністрацыя забрала ва ўсіх зняволеных даведкі, якія дазвалялі насіць акуляры ці карыстацца кіем. Без гэтай даведкі акуляры і кій лічыліся «забароненымі прадметамі».

> «У каго былі кіі — ва ўсіх забралі. У каго былі акуляры — таксама. Пераатрымаць даведку можна было толькі праз медчастку, а на гэта сыходзілі месяцы. Людзей садзілі на прамзону без акуляраў, што магло прывесці да новых траўмаў».

Фактычная забарона на нашэнне акуляраў зняволенымі стварала пагрозу для іх здароўя і жыцця: чалавек не мог выконваць працу ці нават проста перасоўвацца бяспечна. Але адміністрацыя ў асобе медперсанала мэтанакіравана зацягвала з выдачай дазволаў.

Адзін зняволены, які адбываў у ПК-1 вялікі тэрмін, амаль цалкам аслеп. На скаргі са зрокам ніхто не рэагаваў — акуліста ў калоніі не было, акуляры не выдавалі.

> «У яго пачаліся праблемы са зрокам, але медыкі не надавалі ніякай дапамогі. У выніку да выхаду чалавек практычна аслеп. Магчыма, калі б яго своечасова паглядзеў акуліст, можна было б нешта зрабіць. А так там асноўны прынцып: пакуль яшчэ ходзіш — ніякай дапамогі, хутчэй за ўсё, не атрымаеш».

## Стаматалагічная дапамога

у ПК-1 таксама зводзіцца да мінімуму. Афіцыйна ў калоніі ёсць стаматалагічны кабінет, куды прыязджае лекарка з гарадской паліклінікі. Яна можа лячыць зубы і ставіць пломбы. Але адміністрацыя жорстка абмяжоўвае доступ да лячэння.

> «Начальнік калоніі Пальчык Андрэй Сяргеевіч дазволіў толькі адзін від стаматалагічных паслуг — выдаленне. Калі ў цябе зуб баліць — ці рвеш, ці церпіш. Калі просіш палячыць — “да пабачэння”».

Былыя палітзняволеныя распавядаюць, што часам лекарка ўсё ж ставіла пломбу, але гэта было выключэннем і ішло насуперак з указаннямі начальніка. Калі адміністрацыя даведвалася пра гэта, наступствы для зняволенага былі сумныя: яго маглі пакараць, пасадзіць у ШІЗА, пазбавіць перадачаў.

Любая ініцыятыва вылекаваць зуб замест выдалення ўспрымаецца як парушэнне. У выніку многія зняволеныя выходзяць з ПК-1 са стратай зубоў.

> «Было такое, што ў хлопца запалілася дзясна, вывелі яго да лекара, замарозка не ўзяла, і яму паўгадзіны рвалі зуб. Ён некалькі разоў губляў прытомнасць ад болю. Намучыўся жудасна».

З **лекаў** зняволеным выдаецца ў асноўным толькі ібупрафен. Перанаселенасць у бараках, антысанітарыя, холад — усё гэта прыводзіць да выбухаў захворванняў, якія таксама застаюцца без належнай увагі медыкаў.

> «У бараку плошчай 50 квадратных метраў жывуць па 30-32 чалавекі, што недапушчальна з пункту гледжання эпідэміялагічнай сітуацыі».

Да таго ж калонія размешчаная побач з хімічнай вытворчасцю, і зняволеныя 24 гадзіны на суткі дыхаюць прамысловымі выкідамі. Унутры самой зоны — пастаянны смог ад хімікатаў. Гэтыя фактары сур'ёзна ўплываюць на здароўе зняволеных. Ніякіх фільтраў і масак ім не выдаюць. Рэгулярных медаглядаў, нават калі людзі пачынаюць масава кашляць, не праводзіцца.

У такіх умовах лёгка распаўсюджваюцца інфекцыі і заразныя хваробы. Вясной 2024 года ў ПК-1 пачаўся масавы выбух кароста. За некалькі тыдняў заразіліся дзясяткі (калі не сотні) зняволеных. Невядома, ці атрымаў гэты

выбух хоць нейкае лекаванне — зняволеныя паведамлялі родным толькі пра тое, што многія пакрытыя сыпам, але ніякага каранціну ў калоніі не ўводзілі.

Аналагічныя гісторыі здараліся і раней.

> «Зімой у калоніі распачалася эпідэмія грыпу, злеглі адразу сотні чалавек. Але турэмная медыцына і тады не адрэагавала належным чынам — хворым збівалі тэмпературу той жа порцыяй ібупрафену і адпраўлялі на развод у агульную калону. Ні ізаляцыі заражаных, ні дэзінфекцыі баракаў праведзена не было, з-за чаго перахварэлі практычна ўсе».

Любыя просьбы да родных перадаць вітаміны ці перавязачныя матэрыялы спыняюцца. Многім палітычным забараняюць нават атрымліваць пасылкі з лекамі ад родных.

У палітычнага зняволенага Канстанціна Прусава, які адбываў тэрмін у ПК-1, быў цукровы дыябет I тыпу. Штодня ён меў патрэбу ў ін'екцыях інсуліну. Нягледзячы на афіцыйны статут інваліднасці, яго трымалі ў звычайным атрадзе і на агульных працах. Прадукты, неабходныя дыябетыку (адмысловае харчаванне ці замена цукру), яму не давалі. Толькі дзякуючы перадачам з волі і падтрымцы іншых зняволеных Канстанцін здолеў кантраляваць сваю хваробу. Аднак за тры з паловай гады ён падарваў сваё здароўе і ў яго пачаліся сур'ёзныя ўскладненні. У прыватнасці, з'явіліся праблемы з сэрцам, моцна ўпаў зрок. Кансультацый медыкаў ці неабходных для лекавання лекаў у калоніі яму не давалі.

# Смерці ў калоніі

Паводле словаў былых зняволеных, у ПК-1 штогод адбываюцца трагедыі: хтосьці здзяйсняе суіцыд ці памірае ад хваробаў, якія не лячыліся ў калоніі. Падобныя смерці адміністрацыя нярэдка выдае за натуральныя, але за афіцыйнымі фармулёўкамі часта хаваюцца канкрэтныя прычыны і канкрэтныя адказныя людзі.

«У калоніі кожны год паміраюць адзін-два чалавекі. Да мяне хтосьці павесіўся. Кожны год хтосьці або забівае сябе, або памірае ў медчастцы».

Сістэматычны ціск адміністрацыі ў спалучэнні з адсутнасцю псіхалагічнай дапамогі фармуе ў калоніі ўмовы, пры якіх выпадкі суіцыду становяцца частай і заканамернай з'явай.

«Пры мне там адзін чалавек павесіўся. Ніякай падтрымкі з волі яму не надавалася, маральна цяжка сябе адчуваў. Там ёсць псіхолаг, але гэта супрацоўніца міністэрства ўнутраных спраў, жонка аднаго з рэжымнікаў, такая ж трымай-морда, як і ўсе астатнія».

Таксама ў студзені 2021 года стала вядома пра смерць двух асуджаных[33], якія адбывалі пакаранне ў ПК-1: 25-гадовага Андрэя Дубіка і 27-гадовага Аляксея Жука. Родныя Дубіка паведамлялі[34], што ў калоніі на яго псіхалагічна ціснулі. Яго выклікала начальства, пераконваючы прызнаць віну і патрабуючы спыніць перапіску з праваабаронцамі. Апошні ліст ад Андрэя прыйшоў 8 студзеня. Неўзабаве стала вядома, што ён скончыў жыццё самагубствам у карцары.

Адмова ў медыцынскай дапамозе ў ПК-1 нярэдка становіцца прычынай смерцяў. Зняволеныя ўспамінаюць выпадкі, калі жыцці людзей можна было выратаваць, калі б турэмныя лекары адрэагавалі своечасова і адказна паставіліся да іх стану здароўя.

[33] https://www.svaboda.org/a/32826995.html
[34] https://masheka.by/belnews/7224-v-karcere-ik-1-novopolocka-pokonchil-s-soboj-25-letnij-andrej-dubik.html

«Уначы адзін мужчына (гадоў 45, не палітычны) адчуў, што яму дрэнна з сэрцам. У медчастцы яму нават ціск не памералі, проста далі нейкія таблеткі: маўляў, не трэба сімуляваць. Пад'ём у шэсць раніцы — ён пайшоў на курылку, запаліў і ўпаў мёртвым. Ніхто з адміністрацыі асабліва не перажываў: асуджанага спісаць прасцей, чым службовага сабаку».

Адзін з былых зняволеных расказвае[35] пра хлопца, які страціў у калоніі сваё псіхічнае здароўе. Каб не вазіцца з ім, супрацоўнікі закрывалі яго ў ШІЗА. Ён спаў на бетоннай падлозе, захварэў на пнеўманію. Яго адвезлі ў раённую бальніцу, але выратаваць ужо не змаглі.

У калоніі не раз адзначаліся сітуацыі, калі здзекі і збіццё зняволеных завяршаліся іх смерцю, аднак афіцыйна такія трагедыі выстаўляліся як вынік хваробы ці суіцыду.

«Там хлопца збілі. Як мне ўсе казалі, яго збілі да смерці. Але потым яго павесілі. Сказалі, што ён павесіўся. Яму гадоў 19–20 было».

У калоніі толькі зрэдку прызнаюць уласныя злоўжыванні. Так, у 2023 годзе капітан ПК-1 Ігар Пятроў быў асуджаны да шасці гадоў калоніі за перавышэнне паўнамоцтваў: яго прызналі вінаватым у жорсткім збіцці зняволенага, што ледзь не прывяло да смерці. Аднак гэты выпадак стаў, хутчэй, рэдкім выключэннем, прадыктаваным асцярогай кіраўніцтва аказацца адказнымі, чым шчырым клопатам пра жыццё зняволеных.

«Быў выпадак, калі начальнік аддзялення атрадаў 1–3 Пятроў ударыў асуджанага так, што ў яго адкрыўся ўнутраны крывацёк. Гэты асуджаны выйшаў на волю і напісаў заяву. На начальніка аддзялення завялі крымінальную справу. Пасля гэтага ў калоніі крыху супакоіліся».

[35] https://www.svaboda.org/a/32826995.html

# Супрацоўнікі калоніі

«У ПК-1 было больш неадэкватных супрацоўнікаў, чым адэкватных. Адэкватных можна было па пальцах пералічыць». (Са сведчанняў былога палітзняволенага)

Супрацоўнікамі ПК-1 з'яўляюцца ўсе службовыя асобы, якія праходзяць службу ў папраўчай установе і падпарадкаваныя ДВП. Усе супрацоўнікі ПК-1 з'яўляюцца або супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў, калі яны праходзяць службу, або грамадзянскім персаналам, які забяспечвае дзейнасці ўстановы і яе тэхнічнае абслугоўванне (гэтыя супрацоўнікі з'яўляюцца дзяржаўнымі грамадзянскімі службоўцамі). Усе супрацоўнікі калоніі абавязаныя строга выконваць заканадаўства Рэспублікі Беларусь, прафесійную этыку, прытрымлівацца маральных і этычных нормаў, якія адпавядаюць іх пасадзе.

У ПК-1, як і ва ўсіх астатніх установах ДВП, ёсць строгая іерархія службовых асобаў, заснаваная на займаных пасадах і адмысловых званнях. Пры ёй усе ніжэйшыя супрацоўнікі строга выконваюць усе загады і распараджэнні адміністрацыі калоніі.

Падчас гэтага расследавання экспертамі былі зафіксаваныя масавыя выпадкі здзяйснення злачынстваў, бесчалавечных паводзінаў, дысцыплінарных парушэнняў, непрафесійных і амаральных учынкаў з боку як адміністрацыі калоніі, так і звычайных службоўцаў.

# Начальнік калоніі і яго намеснікі

Відавочным з'яўляецца факт, што любыя дзеянні з боку супрацоўнікаў калоніі здзяйсняюцца або па прамым загадзе адміністрацыі, або з іх маўклівай згоды. Менавіта ад адміністрацыі зыходзіць асноўны пасыл: стварыць бесчалавечныя, фактычна катавальныя ўмовы адбыцця пакарання для ўсіх зняволеных, але асабліва для палітычных.

Начальнік калоніі (былы і дзейны) як вышэйшая службовая асоба ў іерархіі нясе ўсю адказнасць за катаванні і жорсткае абыходжанне ў калоніі. Ён таксама нясе адказнасць за стварэнне неналежных умоваў утрымання ва ўстанове.

«Ні адзін мент ніколі не робіць па сваёй волі нешта супрацьзаконнае, таму што яны баяцца адзін аднаго. Гэта ўсё робіцца, калі ім сказалі канкрэтную рэч. Адзін і той жа наглядчык у памяшканні ШІЗА і ПКТ можа сёння біць, а заўтра ўпотай прынесці таблеткі ад тэмпературы іншым зняволеным, проста таму, што ён бачыць, што ім вельмі дрэнна. У адным выпадку ён дзейнічае як чалавек, а ў іншым — яму так сказалі. Гэта не здымае з яго адказнасці, але вось такая мараль у іх: сёння б'ю, заўтра дапамагаю».

## Машадзіеў Руслан Хікметавіч



ПІБ: Машадзіеў Руслан Хікметавіч
Пасада: начальнік Папраўчай калоніі №1
Дата нараджэння: 1981-09-26

З траўня 2023 года Руслан Машадзіеў займае пасаду начальніка калоніі №1, раней ён быў намеснікам начальніка ў гэтай жа калоніі.[36]

«У параўнанні з Пальчыкам, вядома, мякчэйшы. Ён неяк паадэкватней. Таму што Пальчык наогул шалёны адмарозак. Ён проста кайфаваў. Ён асабіста любіў збіваць людзей».

«У параўнанні з Пальчыкам — адэкватней. Хаця б збіваць зэкаў забараніў. Без патрэбы. Калі ўжо ёсць неабходнасць ужываць сілу, тады будуць. Я ўжо не чуў такіх сітуацый, калі проста так збіваюць зэкаў на Наваполацку, як пры Пальчыку».

«Пры ім маральна стала крышачку прасцей. Але, па факце, нічога не памянялася. Можна вас адпраўляць у ШІЗА, а можна адпраўляць у ШІЗА

[36] https://t.me/MAYDAYMog/3262

так, каб ты тросся, баяўся і адчуваў сябе лайном пастаянна. Вось тут другое знікла».

Нягледзячы на тое, што многія апытаныя характарызуюць Руслана Машадзіева як больш «мягкага» начальніка ў параўнанні з Андрэем Пальчыкам, неабходна адзначыць, што ён таксама з'яўляецца саўдзельнікам злачынстваў рэжыму ў дачыненні да палітычных зняволеных. Як вышэйшая службовая асоба адміністрацыі калоніі, ён абавязаны спыняць любое парушэнне закона і службовых абавязкаў сваіх падначаленых, аднак фактычна ён узначальвае гэтую «машыну» рэпрэсій. У дачыненні да Машадзіева шэраг краінаў увёў персанальныя санкцыі.[37]

«Калі Машадзіеў прэсуе, то гэта проста ўказанне з ДВП. Ён сам таксама ва ўсім вінаваты, саўдзельнік, я яго не апраўдваю».

«Машадзіеў прыйшоў на змену [Пальчыку]. Спачатку было крышачку лепш. Дазволіў насіць кашулі на прамзоне. Але, з іншага боку, забараніў сваё сподняе ў ШІЗА. Я б сказаў, такі ж самадур. Але ў яго няма асабістага садызму. У яго ўсё гэта больш фармальнае. Але ён яшчэ большы бюракрат, усё павінна быць паводле закону, але закон гэты нейкі крывы».

[37] https://www.opensanctions.org/entities/NK-kfypSheRLHezmy8bLkoGV6

# Пальчык Андрэй Сяргеевіч



ПІБ: Пальчык Андрэй Сяргеевіч
Пасада: былы начальнік Папраўчай калоніі №1
Дата нараджэння: 1981-03-03

Пальчык з'яўляецца адным з самых адыёзных супрацоўнікаў калоніі. Менавіта з яго асобай звязваюць пабудову катавальнай сістэмы пакаранняў і жорсткіх умоваў утрымання зняволеных у калоніі. На Пальчыку ляжыць такая ж адказнасць, як і на дзейным начальніку калоніі. Таксама ў дачыненні да Пальчыка шэраг краінаў увялі персанальныя санкцыі.[38]

«Проста ў трох словах — ён сацыяпат, садыст і вар'ят, яму трэба рэальна лячыць галаву».

«Здаравенны лысы амбал, качок. Пад два метры ростам. Стандартны: уявіце сабе вертухая-амапаўца, які дайшоў да звання палкоўніка. Робат, бяздушная машына, абсалютна халаднакроўны, жорсткі чалавек».

«Я чуў, што ён нават сваіх працаўнікоў любіў часам стукнуць».

[38] https://www.opensanctions.org/entities/NK-Z97nt3LXuuFApSfXXDuG7x

«Пальчык стварaў такія ўмовы, каб максімальна мучыць людзей, не толькі фізічна. Ён і сам збіваў зняволеных у ШІЗА, любіў кулакамі памахаць. Ён мог у холад сказаць, што мы яшчэ не перайшлі на зімовае адзенне, “выходзьце ў летнім, стойце пад дажджом, стойце на марозе”».

Асаблівасцю сітуацыі з Пальчыкам з'яўляецца той факт, што ён сам непасрэдна ўжываў гвалт, пагражаў, прыніжаў зняволеных.

«Калі Пальчык быў начальнікам калоніі, там пастаянна збівалі людзей у ШІЗА. Пальчыка чаму і знялі: адна з прычынаў — у ШІЗА чалавека збілі, звязкі яму парвалі. Ён выйшаў і напісаў заяву на начальніка калоніі за збіццё. Ён не быў палітычным, таму, відаць, яго заяву прынялі».

«Ён у твар сказаў начальніку калоніі [Пальчыку], што той яго не зламае. Пальчык сказаў: “Не зламаю? Ну, зараз паглядзім”. І яго ўзялі, на стол, рукі заціснулі. Начальнік калоніі асабіста яго збіваў, прычым да такой ступені, што ў хлопца адкрыўся крывацёк з прамой кішкі. Вельмі моцна збіты быў, а збітых людзей не выпускаюць нікуды».

«Ён мог матам абкласці, проста прынізіць, сказаць: “Ты наогул ніхто, ты не чалавек”. Кажа: “Хто ты такі?” Ты яму кажаш, прадстаўляеш, асуджаны вось такі-та. Ён кажа: “Далей можаш не прадстаўляцца, ты — асуджаны, ты — прыметнік, ты не чалавек».

«Вылучаўся тым, што пенсіянерам казаў: “Вы сюды прыехалі паміраць, мне на вас насраць”».

Для самога Пальчыка звальненне не стала пакараннем: ён спакойна атрымаў новую кіруючую працу ў пенітэнцыярнай сістэме.

# Намеснікі начальніка калоніі

## Журко Вячаслаў Сяргеевіч



ПІБ: Журко Вячаслаў Сяргеевіч
Пасада: намеснік начальніка па рэжымнай і аператыўнай працы
Дата нараджэння: 1986-10-02

Выконваў абавязкі начальніка калоніі ў перыяд паміж Машадзіевым і Пальчыкам. Ён забяспечвае выкананне рэжымных патрабаванняў у калоніі і ажыццяўляе агульнае кіраванне аператыўнымі працаўнікамі. Менавіта на ім ляжыць адказнасць за абмежаванне ў правах палітычных зняволеных у параўнанні з іншымі асуджанымі, яго падначаленыя з'яўляюцца адказнымі за сістэматычныя беспадстаўныя афармленні парушэнняў у дачыненні да палітзняволеных.

««Ён нам прамываў мазгі, каб сваякі не тэлефанавалі ў калонію, таму што яны не могуць ім адказваць на пытанні, што з намі адбываецца».

«Там за кожным зняволеным, які на прафуліку, замацаваны куратар. У мяне быў куратар падпалкоўнік Журко. Ён больш-менш адэкватны, вельмі хітры чалавек, ён быў крыху больш дальнабачны, чым многія з адміністрацыі. Я яму сказаў: “Вось вы мне забараняеце размаўляць з

Бабарыкам — на якой падставе?” “Падставаў няма, і я табе не забараняю, я табе раю”».

«Ён худы, рыжы, высокі, 1,85 м. Ён мяне тады ў ШІЗА і адпраўляў. Бо начальніка калоніі не было. І яшчэ казаў: “Дык можа цябе на ПКТ закрыць, а потым на крытую звазіць?” Я кажу: “Ну, калі ёсць за што, тады можаце закрыць і звазіць на крытую?” Ён кажа: “Ну, будзем над табой працаваць”».

# Крыўко Уладзімір Валяр'янавіч



ПІБ: Крыўко Уладзімір Валяр'янавіч
Пасада: намеснік начальніка па выхаваўчай частцы
Дата нараджэння: 1978-08-15

У прафесійныя абавязкі гэтага намесніка начальніка калоніі ўваходзіць пабудова сістэмы рэсацыялізацыі асуджаных, кіраўніцтва ёй, а таксама арганізацыя ўсіх масавых мерапрыемстваў у калоніі. У рэальнасці ён таксама займаўся пераследам палітычных зняволеных, пагражаў ім, прымушаў удзельнічаць у прапагандысцкіх мерапрыемствах.

«Ён сам па сабе як двудушны джокер, яго не зразумееш. Ён вельмі хітры, як ліс. Калі ў камунікацыі з ім ты недзе праявіш слабіну, то ўсё, лічы, што ты трапіўся».

«Ён таксама вельмі шмат нашкодзіў людзям. Мяне ўгаворваў даць інтэрв'ю дзяржаўнаму тэлеканалу, прымусіў нават пісаць заяву на імя начальніка, што я яго даваць не буду па сямейных абставінах. Таму што не хачу, каб мая сям'я мяне бачыла па тэлевізары. Ён прымушаў, мяне прыводзілі разоў пяць, каб я даў інтэрв'ю, я сказаў, што не буду

гэтага рабіць. Тады якраз здымалі гэтага Пальчыка з пасады, таму яны хацелі так адмазацца, паказаць па тэлевізары, што ў лагеры ўсё нармальна».

# Аператыўнікі

Аператыўныя супрацоўнікі ПК-1 абавязаныя праводзіць у калоніі аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, накіраваныя на выяўленне і раскрыццё злачынстваў, падтрыманне парадку ўнутры ўстановы і прафілактыку злачынстваў у будучыні з боку асуджаных. Аднак замест выканання сваіх абавязкаў яны ўдзельнічалі ў сістэматычным пераследзе палітычных зняволеных, фальсіфікацыі ў дачыненні да іх парушэнняў, запалохванні і іншым бесчалавечным стаўленні да іх.



ПІБ: Смалякоў Дзяніс Віктаравіч
Пасада: аператыўны супрацоўнік
Дата нараджэння: 1995-10-28



ПІБ: Кісялёў Аляксандр Уладзіміравіч
Пасада: аператыўны супрацоўнік
Дата нараджэння: 1994-08-24

«Смалякоў, дробны, і Кісялёў, другі. Ім зараз гадоў 28–30. Опер на тое і опер, усё зразумела. Наўпрост ад яго шкоды не відаць, але ўсе разумеюць, што гэта ўсё з-за яго. Яны на ўсё ўплываюць, усё даведаюцца, але звычайна да цябе проста прыходзяць і кажуць, што ў цябе будзе рапарт ад “атрадніка”».

«Начальнік атрада нічога не вырашае. Усё вырашаюць аператыўныя працаўнікі.

Аператыўныя, рэжымныя працаўнікі — гэта тыя людзі, якія ўсталёўваюць клімат у калоніі».

«Яфім. Худы, невысокі, 1,70–1,80 м, вельмі маладжава выглядаў. Але ўвогуле без тармазоў. Ён караў людзей месячным прыбіраннем за тое, што яны проста былі ў пальчатках. На вуліцы стала халодна, а ён прыбег і сказаў: “Хто вам сказаў пальчаткі надзець?” Пакараў чалавек дзесяць, хто не паспеў паздымаць пальчаткі. Потым пачаў людзей у ШІЗА закрываць. На сталай ужо аснове. Прыбягаў, даваў парушэнні, без перапынку».

# ДПНК

Па заканадаўстве ДПНК граюць важную ролю ў сістэме ўнутранага кантролю ў калоніі, ажыццяўляюць нагляд за агульным парадкам, кантралююць паводзіны зняволеных, забяспечваюць выкананне рэжыму папраўчай установы. Фактычна ў ПК-1 ДПНК з'яўляюцца супрацоўнікамі, якія на пастаяннай аснове ажыццяўляюць перапслед палітычных зняволеных, пачынаючы з напісання надуманых рапартаў пра парушэнні і заканчваючы непасрэдным ужываннем гвалту.

## Холмачев Филипп Владимирович



ПІБ: Халмачоў Філіп Уладзіміравіч
Пасада: дзяжурны памочнік начальніка калоніі
Дата нараджэння: 1993-12-31

Дадзены супрацоўнік, паводле сведчанняў апытаных палітычных зняволеных, сістэматычна ўжываў катаванні да асуджаных, за што і быў падвышаны ў званні датэрмінова.

«Філіп, вялікі такі, збольшага адказваў, як я зразумеў, за ШІЗА: калі трэба было кагосьці прэсануць, яны там прэсавалі. Таму ён, такі малады,

п, і выбіўся ў маёры; маёрам ён быў, калі я вызваляўся».

«Ён [Халмачоў] у ШІЗА збіваў людзей».

«Было чуваць крыкі. Чаму я ведаў, што гэта ён, — таму што чалавек крычаў: “Перастаньце, Філіп Уладзіміравіч, перастаньце, вы што, не бачыце, што мне балюча”. Відаць, не ён адзін, хтосьці трымаў зняволенага. Яны практыкуюць так: нахіляюць жыватом на металічны стол, рукі ўніз. За рукі трымаюць, і пачынаецца збіццё гумовай дубінкай па нырках, па ягадзіцах, таму што гэта вельмі балюча. Яго збілі, і пасля гэтага ён замоўк недзе суткі. Мы нават пачалі перажываць за яго. Потым ён пачаў прасіць лекара, і ўжо было чуваць, што ён там у дрэнным фізічным стане».

# Азімук Віктар Васільевіч



ПІБ: Азімук Віктар Васільевіч
Пасада: дзяжурны памочнік начальніка калоніі
Дата нараджэння: 1982-03-11

Віктар Азімук сістэматычна прыцягвае палітычных зняволеных да дысцыплінарнай адказнасці шляхам складання фіктыўных рапартаў пра парушэнні. Акрамя таго, ёсць сведчанні пра тое, што ён асабіста стварае невыносныя ўмовы ўтрымання ў калоніі.

««Ён [Азімук] прымушаў падчас дажджу і лужыны прыбіраць, і смецце насіць».

«Падчас змены Азімука пастаянна былі доўгія праверкі. Пастаянна мерзлі, моклі. Вельмі шмат даваў парушэнняў хлопцам, па камерах “адстрэльваў” і даваў пакаранне. Хтосьці гузік не зашпіліў, або хтосьці штосьці лішняе надзеў...»

«Ён заходзіць з ключамі, адчыняе вакно і кажа: “Нешта ў цябе тут горача”. Адчыніў вакно, кажа: “Ну, трымайся”. І выйшаў. Уначы я наогул не спаў. Там сядзець у прынцыпе немагчыма, усё халоднае. Выдаюць робу гэтую, “сцякляшку”, — калі на штосьці сядаеш, цябе адразу пачынае калаціць яшчэ больш».

# «Атраднікі»

«Атраднікамі» з'яўляюцца афіцэры, супрацоўнікі ДВП, на якіх ускладзеныя абавязкі па выпраўленні асуджаных і кантролі над імі непасрэдна ў атрадзе. Фактычна яны з'яўляюцца інструментам рэпрэсій у дачыненні да палітычных зняволеных.

«Калі я прыйшоў у атрад, пачалася размова з начальнікам атрада. Зняволеных ламалі на прызнанне віны: у іх прызнанне — гэта выпраўленне, такая вось парадыгма. Гэтыя размовы зводзяцца да таго, што трэба пагасіць пазовы, трэба пагасіць рэчавую запазычанасць, трэба дапамагаць калоніі фінансава. Прымушаць сваіх сваякоў надаваць матэрыяльную дапамогу, тады нам гэта залічыцца».

«Звычайна гэта лейтэнант, максімум капітан. Можна сказаць, што ён замяшаны абсалютна ва ўсіх рапартах, ён іх афармляе. Фактычна ўсе начальнікі атрадаў памазаныя парушэннямі, яны іх узгадняюць. Усё, што па-за прамзонай, — усё на іх».

# Зіневіч Сяргей Генадзевіч



ПІБ: Зіневіч Сяргей Генадзевіч
Пасада: начальнік аддзялення выхаваўчай працы
Дата нараджэння: 1984-02-08

Дадзены супрацоўнік наўмысна прыніжае і правакуе зняволеных.

«Зіневіч, быў у нас такі маёр, — ён мэтанакіравана на мяне ціснуў. Ён быў начальнікам нашага аддзялення. Прыходзіць на "промку", я іду міма яго і ведаю, што трэба прывітацца. Я, вядома, вітаюся: "Добры дзень, грамадзянін начальнік!" А ён паварочваецца і кажа: "Нешта ты не павітаўся". "Як гэта я не павітаўся? Я павітаўся. Тут людзі былі, чулі". "Са мной трэба не так вітацца, мне трэба ў пояс кланяцца". Гэта прыніжэнне чалавека, ім гэта прыносіць радасць. Ён хацеў мяне справакаваць, а я проста нічога не хацеў казаць».

# Пятроў Ігар Аляксандравіч



ПІБ: Пятроў Ігар Аляксандравіч
Пасада: начальнік аддзялення
Дата нараджэння: 1990-04-27

Дадзены супрацоўнік, паводле сведчанняў апытаных, не праяўляў асаблівай стараннасці ў рэпрэсіях у дачыненні да палітычных зняволеных, але тым не менш у іх удзельнічаў. Цікавасць уяўляе прыцягненне Ігара Пятрова да крымінальнай адказнасці за перавышэнне службовых паўнамоцтваў па арт. 426 КК Рэспублікі Беларусь.[39] Сведкі кажуць, што да гэтага прывёў тыповы выпадак збіцця ў ПК-1.

> «Ён перастаў выходзіць на службу, а потым мы даведаліся, што ён арыштаваны. На зону некалькі разоў прыязджала следчая група, апячаталі яго кабінет, выносілі змесціва сейфа. Не палітычны зняволены зрабіў [нешта], яго пакаралі, і Пятроў яго некалькі разоў ударыў. У таго засталіся сляды. Пятроў забыўся паглядзець на бірку, і аказалася, што чалавек выходзіць праз пару дзён. Ён выйшаў, зняў пабоі і напісаў заяву ў Службу бяспекі ДВП».

[39] https://spring96.org/ru/news/113130

# Іншыя супрацоўнікі калоніі

У гэтым раздзеле мы аб'ядналі ўсіх астатніх супрацоўнікаў ПК-1, якія шырокамаштабна ажыццяўляюць рэпрэсіі ў дачыненні як да палітычных, так і да звычайных зняволеных.

«[Пра супрацоўнікаў, якія маюць дачыненне да збіцця] Маладыя хлопцы, па 22–23 гады. Здаровыя. Адзін такі, Андрэем клічуць, высокага росту, дзесьці 1,96–1,97 м, кілаграмаў 100 вагі».

«Спецыфічная калонія сама па сабе. Супрацоўнікі — адзін горшы за іншага. Адэкватныя былі, прыгадваю трох-чатырох, але ўсё роўна гэта мянты. Кожны са сваімі жорсткімі прыбабахамі, і нічога з гэтым не зробіш».

# Зелянкоўскі Мікалай Аляксандравіч



ПІБ: Зелянкоўскі Мікалай Аляксандравіч
Пасада: супрацоўнік рэжымнага аддзела
Дата нараджэння: 1988-09-19

«Ведаеце, чаму яму далі мянушку “Параша”? Таму што ён, каб цябе закрыць, і ў какахі палезе калупацца».

«Вечна ўсмешлівы, нібы шукае ахвяру. Такая ўсмешка чалавека-вар'ята, усмешка ліса. За ягоную змену людзі стабільна атрымлівалі па 20 парушэнняў. Калі ад 10 да 20 не дасць, то дарма прыйшоў на працу. З гэтых 20 потым чалавек 16 адпраўлялі ў ШІЗА. І так кожную змену».

«Ён з асаблівай нянавісцю ставіўся да палітычных зняволеных. Для яго розныя здзекі [звыклыя], увогуле са зняволеных, але з палітычных асабліва. Ён пастаянна даваў пакаранні, падгаворваў звычайных зэкаў, каб яны падстаўлялі іншых зняволеных».

«Хлопцы на ПКТ з-за гэтага чалавека недаатрымлівалі ежы, проста таму што ён так хацеў».

«Калі ён на прамзону прыходзіў, то гэта таму, што ён ужо ішоў кагосьці караць: каго зловіць, таго і пакарае. Проста мясцовы садыст».

«Зелянкоўскі Мікалай ненавідзеў палітзняволеных. Ён паводзіў сябе як вар'ят. Вельмі многім здароўе падарваў. Ён або выслугоўваецца, або рэальна хворы на галаву».

Асобна адзначым супрацоўнікаў медыцынскай часткі калоніі, якія не толькі не надаюць медыцынскую дапамогу належным чынам, але яшчэ і выконваюць заведама злачынныя загады адміністрацыі калоніі. Акрамя таго, частка супрацоўнікаў непасрэдна ўдзельнічала ў складанні фіктыўных рапартаў за здзяйсненне асуджанымі «парушэнняў».

«Калі начальнікам калоніі быў Пальчык, было зразумела, што рашэнне лячыць ці не лячыць прымае не доктар. Ён глядзіць на начальніка калоніі — махне той галавой ці не махне».

«У медчастцы была начальніца Наталля Мікалаеўна. Ад яе ішоў увесь гэты бруд. Таму што тэрапеўты не хацелі прымаць, не хацелі працаваць. Яна не хацела выпісваць розныя дазволы. Калі чалавек сказаў ёй штосьці не так, штосьці, што ёй не спадабалася, яна піша рапарт, і потым чалавека адпраўляюць у ШІЗА».

«З-за яе не было магчымасці атрымаць якое-небудзь нармальнае лячэнне. Калі яна не магла паставіць дыягназ, яна крычала: “Сімулянт”, — і хворага чалавека везлі адразу на пакаранне».

«Калі не ведаюць, што з табой, на што ты хворы, калі не могуць паставіць дыягназ, то яны цябе адпраўляюць у ШІЗА».

# Чумакоў Юрый Анатольевіч



ПІБ: Чумакоў Юрый Анатольевіч
Пасада: псіхолаг
Дата нараджэння: 1979-12-29

Псіхолаг ПК-1 Юрый Чумакоў не выконвае свае абавязкі, правакуе палітычных зняволеных, пагражае нематывavаным змяшчэннем у ШІЗА.

«Ён [Чумакоў] як згублены. Ён не разумеў, што адбываецца навокал. Мог дакалупацца да дробязяў. Ён забраў у мяне акуляры».

«Ён таксама людзей на размову выводзіў, і потым людзі з'язджалі ў ШІЗА. Бывала, на лекцыі дзе-небудзь вывелі чалавека. "Ды кажы, я ж псіхолаг. Гэта ж нармальная тэма, можам яе паабмяркоўваць". Чалавек сваё меркаванне скажа. Ён такі: "А, ты так думаеш? Ну, з'ездзі на дваццатку ў ШІЗА"».

# Высновы

Пасля 2020 года Наваполацкая калонія папоўнілася новай хваляй палітычных зняволеных, што пацягнула пагаршэнне ўмоваў утрымання. Паводле паведамленняў былых зняволеных, ПК-1 як папраўчая ўстанова ўзмоцненага рэжыму адрозніваецца ад іншых калоній краіны асабліва жорсткім стаўленнем з боку адміністрацыі (падбор супрацоўнікаў, іх навучанне, стыль кіравання), стварэннем бесчалавечных умоваў знаходжання ў ШІЗА і ПКТ, псіхалагічным і фізічным гвалтам у дачыненні да зняволеных. Усе гэтыя фактары наўпрост звязаныя з палітычнай абстаноўкай у краіне і ўстаноўкамі Дэпартамента выканання пакаранняў і найвышэйшага кіраўніцтва краіны.

ПК-1 характарызуецца жорсткім рэжымам з істотнымі абмежаваннямі асабістай прасторы. Падвышаная шчыльнасць размяшчэння, частыя праверкі, а таксама абмежаваны доступ да гігіенічных працэдураў і бытавых паслугаў ствараюць вельмі цяжкія ўмовы. Харчаванне недастаткова збалансаванае і не адпавядае элементарным патрабаванням якасці, што адмоўна адбіваецца на здароўі зняволеных.

У ПК-1 правы зняволеных на пасылкі, спатканні, перапіску, тэлефонныя званкі і доступ да адваката сістэматычна абмяжоўваюцца і адвольна парушаюцца. Адміністрацыя выкарыстоўвае пазбаўленне гэтых правоў як інструмент ціску, часта пад надуманымі падставамі, асабліва ў дачыненні да палітычных зняволеных.

Арганізацыя працы ў калоніі носіць прымусовы і дыскрымінацыйны характар, асабліва ў дачыненні да палітычных зняволеных, якіх сістэматычна накіроўваюць на найбольш цяжкую, шкодную і небяспечную працу пры адсутнасці належных умоваў аховы працы, сродкаў індывідуальнай абароны і працоўнага адзення. Працоўныя нормы і графікі ўжываюцца ў сукупнасці з дадатковымі пазапланавымі заданнямі, уключаючы працу ў выходныя і начны час, што пазбаўляе зняволеных неабходнага адпачынку і вольнага часу. Узнагароджанне за працу з'яўляецца неадпаведна нізкім і часта мае фіктыўны характар. Праца за такую аплату фактычна з'яўляецца рабскай працай. Адмова ад выканання працы ці невыкананне нормаў кваліфікуецца як парушэнне рэжыму і суправаджаецца дысцыплінарнымі спагнаннямі, уключаючы змяшчэнне ў ШІЗА. Сукупнасць гэтых фактараў сведчыць пра злосныя парушэнні нормаў аховы працы, а таксама пра выкарыстанне працоўнага працэсу як інструмента рэпрэсій і ціску.

У ПК-1 назіраюцца сістэмныя праблемы, звязаныя з гарантаваннем бяспекі здароўя зняволеных і належнага медыцынскага догляду за імі. Паводле расповедаў былых зняволеных, паўнавартаснае медыцынскае абслугоўванне ў калоніі не ажыццяўляецца. Больш за тое, адмова ў меддапамозе выкарыстоўваецца як элемент ціску і катавання. Такім чынам, права на ахову здароўя для зняволеных фактычна адсутнічае, што груба парушае як нацыянальныя законы, так і базавыя прынцыпы правоў чалавека.

У сувязі з псіхалагічным і фізічным ціскам зафіксаваныя выпадкі суіцыдаў, у тым ліку ў ШІЗА і на прамзоне, а таксама смерці, выкліканыя гвалтам і грэбаваннем станам здароўя зняволеных.

Былыя зняволеныя пацвярджаюць той факт, што ў ПК-1 распрацаваная і дзейнічае жорсткая сістэма ціску на палітзняволеных і здзекаў з іх. Для гэтага выкарыстоўваюць разнастайныя спосабы, такія як жорсткія ўмовы ўтрымання, цяжкая фізічная праца, неаднаразовае змяшчэнне ў ШІЗА / ПКТ, а потым перавод у «крытую» турму. Зафіксаваны выпадак, калі адзін са зняволеных адбываў у ШІЗА 100 сутак з паўтара года знаходжання ў калоніі.

Асаблівую заклапочанасць выклікае стаўленне кіраўніцтва калоніі да Віктара Бабарыкі, Андрэя Пачобута і іншых палітзняволеных, якія вымушаныя большую частку часу праводзіць у ШІЗА ці ПКТ пад жорсткім кантролем, у цяжкіх умовах і поўнай ізаляцыі ад грамадства.

Супрацоўнікі калоніі, з аднаго боку, выкарыстоўваюць разгалінаваную сістэму даносаў і правакацыяў, якія ажыццяўляюцца зняволенымі, з іншага — менавіта яны складаюць фіктыўныя рапарты пра парушэнні, ілжэсведчаць, ужываюць фізічны і псіхалагічны гвалт да зняволеных. Шмат у чым такія паводзіны супрацоўнікаў абумоўленыя іерархічнай сістэмай падпарадкавання вышэйшым службовым асобам калоніі, якія не толькі непасрэдна стаяць за катаваннямі і іншым жорсткім абыходжаннем са зняволенымі, але і ствараюць умовы беспакаранасці за любыя злачынныя дзеянні ў дачыненні да «палітычных». Існаванне такой жорсткай сістэмы падпарадкавання ў ПК-1 не вызваляе ад адказнасці шараговых супрацоўнікаў.

Уяўляецца, што фактычна злачынныя дзеянні супрацоўнікаў калоніі трапляюць пад кваліфікацыю не толькі па крымінальным законе Беларусі, але і па нормах міжнароднага права.